МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА

ДЛЯ ЎСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ
З БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАМІ НАВУЧАННЯ

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## V–XI класы

*Зацверджана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2012

УДК 811.161.3(073.3=161.3=161.1)
ББК 74.268.1Беи
У91

ISBN 978-985-465-998-5

© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2012
© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2012

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма па беларускай мове падрыхтавана ў адпаведнасці з Канцэпцыяй вучэбнага прадмета «Беларуская мова». Асноўныя палажэнні Канцэпцыі грунтуюцца на тым, што беларуская мова з'яўляецца адной з дзяржаўных моў у Рэспубліцы Беларусь, а таксама каштоўным сацыяльна-культурным скарбам нацыі. Беларускі народ у сваёй мове, міфалогіі, вусна-паэтычнай творчасці, літаратуры, мастацтве пакінуў у спадчыну нашчадкам сваё разуменне каштоўнага, разумнага і прыгожага. У беларускай мове, як і ў мовах іншых народаў, адлюстравана адзіная, самабытная і непаўторная карціна свету.

Ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі беларускую мову трэба вывучаць не толькі як знакавую сістэму і сродак абмену думкамі. Неабходна так наладжваць працэс навучання, каб адным з галоўных напрамкаў у рабоце настаўніка стала фарміраванне сапраўднага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь, удумлівага чытача, адукаванага суразмоўніка, спагадлівага, высакароднага чалавека. Патрэбна дапамагаць вучням выпрацоўваць навыкі, неабходныя для самаадукацыі, самапазнання і выхавання, вучыць карыстацца імі ў штодзённым жыцці.

У сістэме ўсіх навук надзвычай важнае значэнне мае логіка-лінгвістычны кампанент. Менавіта ён забяспечвае функцыянаванне навукі ў грамадстве. Хоць кожная з галін навукі мае сваю ўласную мову (слоўнікі, алфавіты, паняцці, тэрміны, формулы выражэння сэнсу), аднак усё гэта дапаўняецца і суправаджаецца ў практыцы навучання ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі словам. А гэта азначае, што беларуская мова з'яўляецца не толькі прадметам вывучэння, але і сродкам пазнання, развіцця і выхавання.

**Задача моўнай адукацыі** — абудзіць павагу да беларускага слова, працэсу пазнання, імкненне спасцігаць нацыянальную культуру і культуры іншых народаў, стымуляваць уменне захапляцца дзівосным светам прыроды, захоўваць і ўпрыгожваць яго.

Для гэтага неабходна:

- па-першае, сфарміраваць у вучняў свядомае разуменне самабытнасці і непаўторнасці беларускай мовы як адзінай і ўнікальнай з'явы на свеце, сродку, які на працягу многіх вякоў задавальняе запатрабаванні нацыі, дапамагае людзям абменьвацца думкамі і духоўнымі каштоўнасцямі, разумець адзін аднаго і ўзаемадзейнічаць ва ўсіх відах працы. Мова захоўвае веды пра чалавека і Сусвет, стварае гістарычнае этнакультурнае асяроддзе, у якім адбываецца станаўленне характару чалавека і яго індывідуальнасці;
- па-другое, дапамагчы вучням зразумець, што па сваёй будове мова з'яўляецца ўладкаванай сістэмай, надзвычай дасканалым механізмам, у якім суладна, згодна з яго спецыфічнымі законамі ўзаемадзейнічаюць гукі, марфемы, словы, іх формы, словазлучэнні і сказы. Менавіта дзякуючы гэтаму з яе дапамогай можна занатаваць рэальныя звесткі пра падзеі і факты, думкі людзей, іх пачуцці, эмоцыі, уяўленні, мастацкія вобразы.

Вывучэнне беларускай мовы не можа абмяжоўвацца запатрабаваннямі асобы ў лінгвістычных ведах, знаёмствам вучняў з моўнымі адзінкамі і законамі. Абавязак устаноў агульнай сярэдняй адукацыі — навучыць вучняў карыстацца беларускім словам, дапамагчы ім авалодаць маўленчай этыкай і культурай. Вучням трэба даць такую лінгвістычную адукацыю, якая дапаможа ім не толькі граматычна правільна ствараць і афармляць свае вусныя і пісьмовыя паведамленні, але выбіраць з багатага арсенала выяўленчых моўных сродкаў самыя трапныя, дасканалыя і пераканальныя. Інакш кажучы, праграма арыентуе на неабходнасць фарміравання ў вучняў высокай маўленчай культуры.

У сувязі з гэтым неабходна штодзённа ўдасканальваць маўленчую практыку вучняў, якая наладжваецца ў форме гутаркі, пісьма, чытання, публічных выступленняў, слухання радыё- і

тэлеперадач, вучэбных лекцый, дакладаў, паведамленняў. Гэтым сцвярджаецца тая думка, што ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі да маўлення трэба падыходзіць як да адной з формаў пазнавальнай дзейнасці чалавека, спосабу яго грамадскай актыўнасці, сродку сацыялізацыі.

Менавіта на вырашэнне гэтых і іншых задач скіраваны змест і будова праграмы па беларускай мове. Адметнай яе асаблівасцю з'яўляецца тое, што ў цэнтры ўвагі — вучань як суб'ект, зацікаўлены ў пазнанні, вывучэнні разнастайных законаў беларускай мовы і правілаў карыстання ёй; яго запатрабаванні ў сферы маўлення як форме грамадскай дзейнасці і спосабе праяўлення ўласнай жыццёвай актыўнасці.

Маўленчая дзейнасць не можа наладжвацца без усведамлення сітуацыі і мэтанакіраванасці. Выказванне заўсёды мае свайго адрасата. Мэтай яго можа стаць паведамленне факта ці выяўленне яго прычыны, пабуджэнне да дзеяння іншых людзей ці прызнанне свайго абавязку. Вядома, такія віды маўлення, як зварот, перапрошванне, віншаванне, парада, наогул немагчымы без непасрэднага ці апасродкаванага ўзаемадзеяння з іншай асобай. Гэтаму падпарадкавана логіка і методыка падачы лінгвістычнага матэрыялу. Паслядоўнасць раздзелаў, іх змест і метадычная апрацоўка накіроўваюць не толькі на авалодванне лінгвістычнымі ведамі, хоць гэта задача па-ранейшаму застаецца надзвычай актуальнай. Шмат увагі надаецца выпрацоўцы ў вучняў здольнасці прымяняць атрыманыя веды, уменні і навыкі на практыцы ў ходзе гутаркі, чытання тэкстаў, падрыхтоўкі вусных і пісьмовых паведамленняў розных тыпаў, стыляў і жанраў. Такі падыход патрабуе перамяшчэння акцэнтаў з калектыўных формаў працы на індывідуальна-групавыя. Вядома, што навыкі моўнага аналізу, чытання, вуснага і пісьмовага маўлення чалавек можа выпрацаваць толькі ўласнымі намаганнямі ў ходзе выканання ім адпаведных практыкаванняў. Пры такім падыходзе паралельна дасягаюцца тры дыдактычныя мэты. Па-першае, вучні ў ходзе шматаспектнага сэнсава-стылістычнага і логіка-граматычнага аналізу навучаюцца метадам і прыёмам, неабходным для асэнсавання мовы, а таксама для выяўлення функцыі, будовы і значэння яе адзінак. Па-другое, яны засвойваюць тэхніку выяўлення зместу

тэксту, абапіраючыся на высвятленне яго тэмы, асаблівасцей яе разгортвання ў падтэмах; выяўленне адрасата; знаходжанне ключавых слоў і словазлучэнняў, апорных сказаў. Па-трэцяе, прывучаюцца адказна, патрабавальна, аналітычна падыходзіць да таго, што ім трэба напісаць ці сказаць, і да таго, як гэта можна зрабіць.

Такі падыход да арганізацыі навучання беларускай мове дазваляе, не зніжаючы аб'ёму ведаў, развіваць лінгвістычныя здольнасці вучняў, прывучаць іх самастойна працаваць.

Праграма па беларускай мове пабудавана з улікам прынцыпаў сістэмнасці, навуковасці і даступнасці, а таксама пераемнасці і перспектыўнасці паміж рознымі раздзеламі курса.

**Мэта** вывучэння прадмета «Беларуская мова» — сфарміраваць у вучняў сістэму ведаў пра мову і маўленне, навучыць карыстацца беларускай мовай ва ўсіх відах маўленчай дзейнасці (чытанне, слуханне, гаварэнне, пісьмо); развіваць інтэлектуальную, камунікатыўную, духоўна-маральную і грамадзянскую культуру вучняў.

**Задачы:**

- засваенне сістэмы мовы (фанетыкі, лексікі, фразеалогіі, складу слова і словаўтварэння, марфалогіі, сінтаксісу), заканамернасцей і правілаў функцыянавання моўных сродкаў у маўленні, нормаў беларускай літаратурнай мовы, развіццё ўмення практычнага выкарыстання мовы (моўная кампетэнцыя);
- фарміраванне камунікатыўных уменняў на аснове авалодання маўленчай тэорыяй (тэкст, тыпы, стылі і жанры маўлення) і культурай маўлення, уменняў ствараць самастойныя вусныя і пісьмовыя выказванні розных тыпаў, стыляў і жанраў (камунікатыўная кампетэнцыя);
- усведамленне вучнямі мовы як феномена культуры, у якім знайшлі адбітак яе праяўленні, выпрацоўка ўменняў карыстацца культуразнаўчымі звесткамі з мэтай забеспячэння паўнацэннай камунікацыі (лінгвакультуралагічная кампетэнцыя);
- развіццё сродкамі мовы інтэлектуальнай, камунікатыўнай, духоўна-маральнай і грамадзянскай культуры вучняў.

Лінгвістычны матэрыял падаецца ў праграме лінейна: у V класе вывучаюцца фанетыка і арфаэпія, графіка і арфаграфія, лексіка і фразеалогія, склад слова і словаўтварэнне, у VI і VII класах — марфалогія: назоўнік, прыметнік, займеннік, лічэбнік, дзеяслоў; формы дзеяслова (дзеепрыметнік і дзеепрыслоўе), прыслоўе, службовыя часціны мовы і выклічнік. Сістэматычны курс сінтаксісу і пунктуацыі з'яўляецца прадметам вывучэння ў VIII—IX класах. Аднак першапачатковыя звесткі пра сінтаксіс і пунктуацыю ўводзяцца ўжо ў V класе. Гэта дазваляе на практыцы забяспечыць рэалізацыю такіх метадычных прынцыпаў, як мэтанакіраванае апярэджанне, пераемнасць з праграмай I—IV класаў і перспектыўнасць. Пры ўмове правільнай арганізацыі адукацыйнага працэсу мэтанакіраванае апярэджанне дапаможа, пачынаючы з V класа, задоўга да вывучэння сістэматычнага курса сінтаксісу і пунктуацыі пазнаёміць вучняў з асноўнымі сінтаксічнымі паняццямі і на гэтай аснове фарміраваць у іх пунктуацыйныя ўменні і навыкі, развіваць і ўдасканальваць граматычны лад маўлення; вучыць складаць словазлучэнні рознай будовы, сказы, тэксты і карыстацца імі ў маўленчай дзейнасці.

У кожным класе прадугледжваюцца ўводныя ўрокі, якія раскрываюць ролю і значэнне беларускай мовы ў жыцці чалавека і грамадства. Гэтыя ўрокі даюць магчымасць фарміраваць лінгвістычны светапогляд і ствараюць эмацыянальны настрой, што садзейнічае павышэнню цікавасці да прадмета і паспяховаму яго вывучэнню.

Значнае месца ў праграме адводзіцца паўтарэнню вывучанага. У V класе раздзел «Паўтарэнне вывучанага ў I—IV класах», з'яўляючыся неабходным звяном паміж першай (пачатковая адукацыя) і другой (базавая адукацыя) ступенямі агульнай сярэдняй адукацыі, скіраваны на вырашэнне наступных задач: узнавіць і сістэматызаваць веды, уменні і навыкі, набытыя ў I—IV класах; у межах магчымага выявіць і ліквідаваць недахопы ў ведах, уменнях і навыках вучняў. Для паўтарэння ў пачатку і ў канцы навучальнага года ў кожным класе адводзяцца спецыяльныя гадзіны. Такая сістэма паўтарэння садзейнічае забеспячэнню неабходнага ўзроўню трывалых ведаў, уменняў і навыкаў.

Работа па развіцці маўлення арганізуецца на кожным уроку, пры вывучэнні ўсіх раздзелаў і тэм курса беларускай мовы. Асобныя гадзіны на развіццё звязнага маўлення па гэтай прычыне не выдзяляюцца. Праграма адводзіць асобныя гадзіны толькі на пісьмовыя работы (напісанне пераказаў, перакладаў, сачыненняў, кантрольных дыктантаў, тэставых работ).

У адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да моўнай і маўленчай падрыхтоўкі вучняў узмоцнена маўленчая накіраванасць курса беларускай мовы. Пры гэтым маўленчая тэорыя (маўленчыя паняцці: тэкст і яго будова, тып, стыль і жанр маўлення) набліжана да патрабаванняў практыкі, яна з'яўляецца асновай для свядомага фарміравання ўменняў і навыкаў камунікацыі. Апора на маўленчыя паняцці і правілы маўленчых паводзін садзейнічае свядомаму ўдасканаленню вуснага і пісьмовага маўлення вучняў, павышэнню культуры маўленчых паводзін.

Маўленчая накіраванасць курса прадугледжвае таксама ўзмацненне семантычнага аспекту ў вывучэнні фактаў і з'яў мовы. У праграме ўлічана тое, што мова з'яўляецца не толькі фармальнай сістэмай, але і семантычнай. Гэта выклікала неабходнасць павялічыць патрабаванні да слова як назвы паняцця і сродку, з дапамогай якога забяспечваецца сувязь гаворачай асобы з адрасатам.

Вывучэнне сінтаксісу ў VIII—IX класах наладжваецца на аснове структурна-семантычнага падыходу, адметнай асаблівасцю якога з'яўляецца тое, што пры аналізе моўных з'яў прымаецца пад увагу не адзін які-небудзь аспект, а некалькі. Найбольш важнымі з іх з'яўляюцца *будова, значэнне* і *функцыя*. Пад кіраўніцтвам настаўніка вучні засвойваюць і выкарыстоўваюць прыёмы працы, патрэбныя для вызначэння функцыі сказа, яго будовы, значэння і прыналежнасці да пэўнага стылю і жанру.

Такая арганізацыя выкладання мовы дазволіць вучням успрымаць не асобныя, разрозненыя моўныя з'явы, а ўсю сістэму ва ўзаемадзеянні яе элементаў, асэнсоўваючы пры гэтым адпаведныя сінтаксічныя паняцці і іх істотныя прыметы. Але гэта магчыма ў працэсе педагагічна арганізаванай працы саміх вучняў. Настаўнік дапамагае наладзіць аналітыка-сінтэтычную

дзейнасць, неабходную для таго, каб выяўляць будову, значэнне і функцыю сінтаксічных адзінак і іх кампанентаў. Выкарыстоўваючы шматаспектны аналіз як сродак пазнання законаў і фактаў мовы, вучні авалодваюць наступнымі найбольш перспектыўнымі для маўленчага і інтэлектуальнага развіцця вучэбнымі прыёмамі:

а) мэтанакіраванымі назіраннямі, якія маюць на ўвазе асэнсаванне асаблівасцей будовы сінтаксічных адзінак, іх значэння і функцыі;

б) падзелам словазлучэнняў і сказаў на кампаненты, асэнсаваннем спосабаў выражэння кампанентаў, іх ролі і месца ў структуры, выяўленнем тыпаў і сродкаў сувязі паміж кампанентамі;

в) параўнаннем словазлучэнняў і сказаў, а таксама іх кампанентаў па будове, значэнні і функцыі;

г) канструяваннем словазлучэнняў і сказаў па схемах, а таксама падборам сінанімічных канструкцый на аснове аналізу першапачатковага варыянта;

д) выпрацоўкай у працэсе аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці арфаграфічных, пунктуацыйных і стылістычных навыкаў, а таксама навыкаў звязнага вуснага і пісьмовага маўлення.

У такіх умовах пры ўспрыманні і асэнсаванні мовазнаўчага матэрыялу актывізуюцца пазнавальныя здольнасці вучняў, выпрацоўваецца ўменне назіраць, знаходзіць істотныя прыметы, самастойна абагульняць атрыманыя ў працэсе пошуку веды, абгрунтоўваць свае дзеянні, удасканальваецца маўленне вучняў.

Пры гэтым разгляд словазлучэнняў і сказаў з пункта погляду іх структурна-граматычнай арганізацыі і лексічнага напаўнення дае магчымасць глыбей асэнсаваць сувязі, якія існуюць паміж лексікай, марфалогіяй і сінтаксісам, забяспечыць сувязь сінтаксісу з марфалогіяй, паўтарыць найбольш складаныя пытанні з курса марфалогіі.

Шмат увагі надаецца выпрацоўцы ўменняў, неабходных для таго, каб тая ці іншая моўная з’ява выкарыстоўвалася ў маўленчай практыцы. Пры такой арганізацыі навучання галоўным дыдактычным матэрыялам з’яўляюцца тэксты, на аснове якіх вырашаюцца задачы, накіраваныя на засваенне нормаў літаратурнага вымаўлення, граматыкі, правапісу, узбагачаецца

слоўнік вучняў, забяспечваецца іх выхаванне і развіццё. Выбар тэксту як дыдактычнай адзінкі стварае сінтаксічную аснову вывучэння моўных з'яў, якія па-за тэкстам не могуць раскрыць сваіх функцыянальных магчымасцей. Толькі ўступаючы ў граматыка-семантычныя адносіны ў тэксце, моўныя адзінкі здольны перадаць змест выказвання. Тэкст на ўроках мовы з'яўляецца сродкам удасканалення камунікатыўных здольнасцей вучняў, забяспечвае магчымасць развіцця маўленчых навыкаў слухання і разумення, чытання, гаварэння і пісьма.

Адукацыйна-выхаваўчае значэнне прадмета «Беларуская мова» на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі акрэсліваецца функцыямі мовы ў грамадстве. Мова выступае асноўным сродкам чалавечых зносін і пазнання рэчаіснасці. Карыстаючыся мовай, асоба засвойвае формы чалавечых узаемаадносін, спазнае маральныя і культурныя каштоўнасці свайго народа. Забяспечваючы моўную адукацыю вучняў, установа агульнай сярэдняй адукацыі павінна ствараць умовы для іх інтэлектуальнага, эмацыянальнага і духоўнага развіцця, рыхтаваць да прафесійнай дзейнасці і актыўнага грамадскага жыцця.

Любы вучань — незалежна ад яго гуманітарнай або негуманітарнай схільнасці — у ідэале ўсведамляе мову як нацыянальна-культурную з'яву ў адзінстве яе пазнавальнай, камунікатыўнай і эстэтычнай функцый.

**Змест навучання** беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі ўключае наступныя раздзелы: «Маўленне», «Слова ў тэксце», «Словазлучэнне і сказ у тэксце», «Культура вуснага і пісьмовага маўлення».

Выкладанне беларускай мовы на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі накіравана на фарміраванне асобы вучня як свядомага носьбіта мовы, развіццё яго інтэлектуальных і творчых здольнасцей. Вучань асэнсоўвае мову як уласную, нацыянальную і агульначалавечую каштоўнасць і мае такі ўзровень падрыхтоўкі, які забяспечвае паўнацэннае выкарыстанне мовы ва ўсіх сферах яе функцыянавання.

**Задачы навучання** мове ў X—XI класах (X—XII класах вячэрніх школ) наступныя:

- паглыбляць лінгвістычныя веды, цэласнае ўяўленне пра мову як культурна-грамадскую з'яву, як гістарычна змен-

лівую, шматфункцыянальную сістэму, у значнай ступені залежную ад грамадскай практыкі;

- замацоўваць і паглыбляць веды вучняў пра тэкст, выпрацоўваць уменні аналізаваць, узнаўляць, ствараць і ўдасканальваць тэксты;
- удасканальваць арфаграфічную і пунктуацыйную пісьменнасць вучняў, асноўныя агульнавучэбныя ўменні;
- замацоўваць і паглыбляць веды і ўменні вучняў па фанетыцы і арфаэпіі, лексіцы і фразеалогіі, складзе слова і словаўтварэнні, марфалогіі і сінтаксісе, стылістыцы беларускай мовы;
- фарміраваць навык рэпрадуктыўнай і прадуктыўнай маўленчай дзейнасці: асэнсаванага і свядомага чытання, адэкватнага ўспрымання маўлення на слых, стварэння выказванняў у вуснай і пісьмовай формах;
- выпрацоўваць навык адэкватных камунікатыўных паводзін, адпаведных канкрэтным маўленчым сітуацыям;
- развіваць інтэлектуальныя і творчыя здольнасці вучняў, фарміраваць навыкі самастойнай вучэбнай дзейнасці;
- выхоўваць пачуццё адказнасці за слова, адчуванне яго прыгажосці і выразнасці.

Такім чынам, праграма ставіць перад педагагічнай практыкай новыя задачы, якія найбольш адпавядаюць сучасным патрабаванням да моўнай і маўленчай падрыхтоўкі вучняў.

## V КЛАС

**(105 гадзін на год, 3 гадзіны на тыдзень;**
**з іх 13 гадзін — на пісьмовыя работы)**

### Мова — найважнейшы сродак зносін

(2 гадзіны)

I. Чалавек і мова. Адрасат. Вусная і пісьмовая формы маўлення. Віды маўленчай дзейнасці: слуханне, чытанне, гаварэнне, пісьмо. Умовы, неабходныя для ўспрымання і стварэння выказвання.

*Чытанне і слуханне вучэбных тэкстаў, вызначэнне іх тэмы, адрасата і мэтанакіраванасці. Пастаноўка пытанняў да тэкстаў, вусныя і пісьмовыя адказы на іх. Паведамленне на тэму «Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства».*

II. Успрымаць тэкст на слых і пры чытанні; выразна, у адпаведнасці з нормамі літаратурнага вымаўлення чытаць тэкст, вызначаць яго тэму, адрасата і прызначэнне; ствараць уласныя выказванні на тэму «Роля мовы ў жыцці чалавека і грамадства».

### Паўтарэнне вывучанага ў I—IV класах

(12 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Тэкст, яго будова. Тэма і асноўная думка тэксту. Сувязь сказаў у тэксце. Загаловак.

*Чытанне і слуханне тэкстаў. Вызначэнне тэмы, асноўнай думкі, падбор загалоўкаў.*

Назоўнік. Род, лік, склон назоўнікаў. Змяненне назоўнікаў у адзіночным і множным ліку.

Прыметнік. Сувязь прыметніка з назоўнікам. Асаблівасці змянення прыметніка па родах, ліках і склонах.

Займеннік. Асабовыя займеннікі, іх змяненне.

Дзеяслоў. Неазначальная форма дзеяслова. Часы дзеяслова. Змяненне дзеясловаў па асобах і ліках, правапіс канчаткаў. Змяненне дзеясловаў прошлага часу па родах, правапіс канчаткаў. Правапіс ***не*** з дзеясловамі.

План тэксту.

*Вусны і пісьмовы падрабязны пераказ тэксту па плане.*

II. Вызначаць тэму, асноўную думку тэксту, даваць яму загаловак, складаць план. Вусна і пісьмова пераказваць змест тэксту.

Правільна вымаўляць гукі пры чытанні; распазнаваць часціны мовы (па агульным значэнні і пытанні).

## Сінтаксіс і пунктуацыя

(23 гадзіны, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Словазлучэнне. Галоўнае і залежнае словы ў словазлучэнні.

Знаёмства са стылямі маўлення (мэта і сфера выкарыстання, жанры).

*Чытанне тэкстаў, вызначэнне іх стылю, знаходжанне словазлучэнняў.*

Сказ як адзінка маўлення. Апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы. Клічныя і няклічныя сказы. Знакі прыпынку ў канцы сказа (паўтарэнне).

*Выяўленне ў тэкстах клічных сказаў, вызначэнне іх сэнсавай ролі. Падзел тэкстаў на сказы. Пабудова сказаў розных тыпаў, уключэнне іх у тэкст.*

Будова сказа. Галоўныя члены сказа: дзейнік і выказнік (паўтарэнне). Даданыя члены сказа: дапаўненне, азначэнне, акалічнасць. Неразвітыя і развітыя сказы.

*Выяўленне ў тэкстах галоўных і даданых членаў сказа, вызначэнне іх сэнсава-граматычнай ролі. Перабудова неразвітых сказаў у развітыя.*

***Кантрольны дыктант.***

Сказы з аднароднымі членамі (без злучнікаў і са злучнікамі, з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах і без іх), знакі прыпынку.

*Чытанне тэкстаў, вызначэнне сказаў з аднароднымі членамі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання. Складанне такіх сказаў, уключэнне ў выказванне.*

Сказы са звароткамі, інтанаванне, знакі прыпынку.

Складаныя сказы з двума галоўнымі членамі ў кожнай частцы, іх інтанаванне. Коска паміж часткамі ў складаным сказе.

*Знаходжанне складаных сказаў у тэксце, вызначэнне іх ролі, складанне новых, уключэнне ў вусныя і пісьмовыя выказванні.*

Простая мова, інтанаванне і афармленне на пісьме. Дыялог. Афармленне дыялога.

Патрабаванні да падрабязнага пераказу.

*Падрабязны пераказ тэкстаў з простай мовай (з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў).*

II. Дзяліць тэксты на сказы, называць граматычную аснову і словазлучэнні.

Карыстацца інтанацыяй для абазначэння межаў сказаў, вызначаць іх прызначэнне і адносіны да зместу выказвання.

Складаць і ўжываць розныя тыпы словазлучэнняў і сказаў (у тым ліку сказы з аднароднымі членамі і звароткамі), выконваць сінтаксічны разбор словазлучэнняў і сказаў, ставіць знакі прыпынку ў адпаведнасці з вывучанымі правіламі.

Чытаць тэксты, вызначаць іх адрасата, стыль, жанр, мэтанакіраванасць; выдзяляць апорныя словы і словазлучэнні, падрабязна пераказваць прачытаныя і праслуханыя тэксты.

### Фанетыка і арфаэпія. Графіка і арфаграфія

(28 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Гукі беларускай мовы. Літара як знак гука. Прызначэнне літар ***е, ё, ю, я, і.***

Беларускі алфавіт. Назвы літар. Склад. Націск. Правілы пераносу слоў.

Знаёмства з тыпамі маўлення: апавяданне, апісанне, разважанне (прызначэнне і будова).

***Кантрольны дыктант.***

Галосныя гукі. Вымаўленне і правапіс галосных ***о, э, а; е, ё, я.*** Вымаўленне і правапіс спалучэнняў ***іё (ыё), ія (ыя), іе (ые)*** у запазычаных словах.

Зычныя гукі. Глухія, звонкія і санорныя, свісцячыя і шыпячыя зычныя. Іх вымаўленне і правапіс.

Цвёрдыя і мяккія зычныя, іх вымаўленне і правапіс. Зацвярдзелыя зычныя, іх вымаўленне і правапіс.

*Чытанне і запіс пад дыктоўку слоў, словазлучэнняў, сказаў і тэкстаў з захаваннем арфаэпічных і арфаграфічных нормаў.*

Мяккі знак і апостраф. Зычныя [д]—[дз′], [т]—[ц′], іх вымаўленне і правапіс. Правапіс ***у, ў***.

Падоўжаныя зычныя, іх вымаўленне і правапіс.

Прыстаўныя зычныя і галосныя, іх правапіс.

Гутарковы стыль, яго выкарыстанне, моўныя асаблівасці, жанры (гутарка).

*Складанне дыялогаў на бытавыя тэмы.*

***Кантрольны падрабязны пераказ мастацкага тэксту.***

II. Адрозніваць гукі і літары; правільна вымаўляць гукі і перадаваць іх на пісьме; тлумачыць напісанні, карыстацца арфаграфічным слоўнікам; рабіць фанетычны разбор слоў.

Вызначаць прызначэнне тэкстаў, іх адрасата, тып, жанр. Выяўляць прыметы гутарковага стылю, складаць дыялогі на бытавыя тэмы; рабіць падрабязны пераказ тэксту.

## Лексіка. Фразеалогія

(18 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Словы як назвы рэчаў, з'яў, паняццяў. Лексічнае значэнне слова.

Адназначныя і мнагазначныя словы. Прамое і пераноснае значэнне слова. Сінонімы. Антонімы. Амонімы (знаёмства).

Агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку. Устарэлыя словы і неалагізмы.

Запазычаныя словы, іх ужыванне і правапіс.

*Паглыбленне паняцця пра мастацкі і навуковы стылі. Знаходжанне ў тэкстах слоў з прамым і пераносным значэннем, амонімаў, сінонімаў, антонімаў, дыялектных, прафесійных, запазычаных, устарэлых слоў, неалагізмаў, тэрмінаў; вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі ў маўленні.*

*Пераклад з рускай мовы на беларускую вучэбных тэкстаў.*

Паняцце пра фразеалагізмы, роля фразеалагізмаў у маўленні.

*Складанне спісаў назваў мясцовасці, запіс фразеалагізмаў, прыказак, прымавак.*

***Кантрольны падрабязны пераказ апавядальнага тэксту.***

II. Вызначаць лексічнае значэнне слова па слоўніку і ў тэксце; знаходзіць у тэксце агульнаўжывальныя словы і словы абмежаванага ўжытку; распазнаваць і правільна пісаць запазычаныя словы, устарэлыя словы і неалагізмы, выкарыстоўваць іх у маўленні; падбіраць да слоў сінонімы і антонімы, карыстацца сінонімамі як сродкам сувязі сказаў у тэксце; знаходзіць фразеалагізмы ў тэксце, тлумачыць іх значэнне; карыстацца тлумачальным, перакладнымі слоўнікамі.

Вызначаць стыль тэкстаў (гутарковы, мастацкі, навуковы), перакладаць на беларускую мову вучэбныя тэксты на лінгвістычную тэму; складаць спісы назваў мясцовасці, запісваць фразеалагізмы, прыказкі, прымаўкі; рабіць падрабязны пераказ апавядальных тэкстаў.

### Склад слова. Словаўтварэнне і арфаграфія

(17 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Змяненне і ўтварэнне слоў. Марфемная будова слова. Аснова і канчатак. Нулявы канчатак. Корань слова (паўтарэнне). Аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго слова. Прыстаўка і суфікс як значымыя часткі слова.

Чаргаванне зычных і галосных у аснове.

Правапіс прыставак, якія заканчваюцца на зычны (паўтарэнне). Правапіс ***і, й, ы*** пасля прыставак.

*Чытанне тэкстаў, выяўленне ў іх аднакаранёвых слоў і формаў аднаго і таго слова, вызначэнне сэнсавай ролі марфем.*

Утварэнне слоў. Утваральная аснова. Спосабы ўтварэння слоў: прыставачны, суфіксальны, прыставачна-суфіксальны; складанне слоў і асноў.

*Пераклад з рускай мовы на беларускую мастацкіх тэкстаў.*

*Тлумачэнне спосабу ўтварэння слоў, падбор аднакаранёвых слоў, складанне з імі сказаў і тэкстаў.*

Утварэнне і правапіс складаных слоў (знаёмства). Складанаскарочаныя словы (знаёмства).

***Кантрольны дыктант.***

II. Адрозніваць аднакаранёвыя словы і формы аднаго і таго слова; групаваць словы па значэнні кораня, суфікса і прыстаўкі; разбіраць словы па саставе, графічна абазначаць марфемы; рабіць словаўтваральны разбор, тлумачыць спосаб утварэння і вызначаць сродкі ўтварэння слоў; карыстацца марфемным і словаўтваральным слоўнікамі.

### Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год

(3 гадзіны)

### Рэзервовыя гадзіны

(2 гадзіны)

## VI КЛАС

**(105 гадзін на год, 3 гадзіны на тыдзень; з іх 14 гадзін — на пісьмовыя работы)**

### Беларуская мова — нацыянальная мова беларускага народа

(2 гадзіны)

I. Беларуская мова як адлюстраванне нацыянальнага бачання свету. Літаратурная мова і народныя гаворкі. Нарматыўнасць — асноўная рыса літаратурнай мовы.

*Чытанне тэкстаў, адказы на пытанні, пераказ тэкстаў на тэму «Беларуская мова — нацыянальная мова беларускага народа».*

II. Чытаць і пераказваць тэксты на тэму «Беларуская мова — нацыянальная мова беларускага народа», расказваць пра самабытнасць беларускай мовы, адрозніваць літаратурную мову ад народных гаворак.

### Паўтарэнне вывучанага ў V класе

(4 гадзіны)

I. Тэкст, яго стылі і тыпы. *Чытанне мастацкіх тэкстаў з элементамі апісання прадметаў, вызначэнне ролі апісанняў*

*у раскрыцці тэмы; вызначэнне стылю тэксту на аснове асэнсавання яго прымет.*

Словазлучэнне і сказ. Знакі прыпынку ў простых і складаных сказах.

*Вызначэнне ў сказах граматычных асноў, словазлучэнняў. Складанне і інтанаванне розных тыпаў сказаў, стварэнне з імі тэкстаў.*

Гукі беларускай мовы. Іх вымаўленне і абазначэнне на пісьме.

*Чытанне тэкстаў мастацкага стылю, вызначэнне іх мэтанакіраванасці, жанру і асаблівасцей будовы. Запіс слоў і сказаў пад дыктоўку.*

Слова, яго лексічнае значэнне.

Марфемная будова слова. Асноўныя спосабы словаўтварэння.

*Чытанне і слуханне навуковых тэкстаў, вызначэнне іх характэрных прымет, адрасата і мэтанакіраванасці. Падзел тэкстаў на лагічныя часткі, знаходжанне апісання моўных з'яў.*

*Вызначэнне ў тэкстах аднакаранёвых слоў і формаў аднаго і таго слова.*

II. Правільна чытаць тэксты, вызначаць іх стыль, жанр і тып, дзяліць на лагічныя часткі і сказы, вызначаць апорныя словы і словазлучэнні, абгрунтоўваць пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах; тлумачыць лексічнае значэнне слоў, адрозніваць словы і іх формы, вызначаць марфемную будову і спосабы ўтварэння слоў; карыстацца рознымі відамі слоўнікаў, правільна перадаваць гукі пры чытанні і на пісьме.

## МАРФАЛОГІЯ І АРФАГРАФІЯ

### Самастойныя і службовыя часціны мовы

(1 гадзіна)

### Назоўнік

(25 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Назоўнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Агульныя і ўласныя назоўнікі. Правапіс уласных назваў (практыч-

на). Назоўнікі адушаўлёныя і неадушаўлёныя. Назоўнікі канкрэтныя, абстрактныя, зборныя, рэчыўныя.

Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам, якія выражаны назоўнікамі.

Афіцыйны стыль маўлення, яго жанры, сфера выкарыстання.

*Чытанне тэкстаў афіцыйнага стылю, распазнаванне ў іх уласных назоўнікаў у пачатковай форме і ва ўскосных склонах. Напісанне афіцыйных папер (адрас на канверце, аб'ява аб занятках гуртка, аб правядзенні сходу).*

Род назоўнікаў. Назоўнікі агульнага роду.

*Вусныя і пісьмовыя практыкаванні на ўжыванне назоўнікаў, род якіх у беларускай і рускай мовах не супадае, дапасаванне да іх прыметнікаў і дзеясловаў прошлага часу.*

Змяненне назоўнікаў. Лік і склон назоўнікаў. Назоўнікі, якія маюць форму толькі адзіночнага ці толькі множнага ліку. Несупадзенне ліку і роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Асновы назоўнікаў. Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення (у давальным і месным склонах адзіночнага ліку). Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення (у родным і месным склонах адзіночнага ліку). Асаблівасці правапісу канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення (у творным склоне адзіночнага ліку). Правапіс канчаткаў назоўнікаў у множным ліку (у родным і творным склонах).

*Знаходжанне ў тэкстах назоўнікаў 1, 2, 3-га скланення, тлумачэнне правапісу канчаткаў.*

***Кантрольны дыктант.***

*Складанне спісаў вучняў і назваў населеных пунктаў сваёй мясцовасці.*

Скланенне назоўнікаў, якія абазначаюць імёны, прозвішчы і назвы населеных пунктаў на ***-оў, -ёў, -аў, -ын, -ін.***

Рознаскланяльныя назоўнікі. Нескланяльныя назоўнікі.

Спосабы ўтварэння назоўнікаў. Правапіс назоўнікаў з суфіксамі ***-ак, -ык, -ік, -ачк-, -ечк-;*** мяккі знак перад суфіксамі ***-к-, -чык-*** і ў суфіксах ***-аньк-, -еньк-***. Складаныя назоўнікі, іх правапіс.

Правапіс ***не (ня), ні*** з назоўнікамі.

*Складанне і запіс сказаў з назоўнікамі, якія абазначаюць людзей па прафесіі, нацыянальнай прыналежнасці і інш.*

*Чытанне тэкстаў мастацкага стылю, знаходжанне ў іх слоў з вывучанымі суфіксамі, тлумачэнне значэння. Пераклад тэкстаў з рускай мовы на беларускую.*

*Сачыненне-апавяданне ў мастацкім стылі па апорных словах.*

II. Чытаць тэксты, распазнаваць у іх назоўнікі ў пачатковай форме і ва ўскосных склонах, вызначаць іх граматычныя прыметы; правільна ўжываць склонавыя формы назоўнікаў; выкарыстоўваць нескланяльныя назоўнікі, назоўнікі-сінонімы і назоўнікі-антонімы ў вусных і пісьмовых выказваннях; рабіць марфалагічны разбор назоўнікаў; аналізаваць тэксты афіцыйнага стылю.

Пісаць афіцыйныя паперы; складаць сказы з назоўнікамі пэўных семантычных груп; пісаць сачыненне-апавяданне ў мастацкім стылі па апорных словах.

## Прыметнік

(17 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Прыметнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма.

Паглыбленне паняцця пра апісанне: спосабы апісанняў. Апісанне прымет рэчаў, з'яў, людзей, жывёл, ландшафтаў, мясцовасці, памяшканняў.

*Знаходжанне апісанняў у тэкстах мастацкага, навуковага і афіцыйнага стыляў; абгрунтаванне мэтазгоднасці іх ужывання; складанне словазлучэнняў з прыметнікамі, выкарыстанне іх для апісання прымет рэчаў, людзей, жывёл, з'яў і інш., уключэнне ў тэкст.*

Якасныя, адносныя і прыналежныя прыметнікі, іх роля ў маўленні. Ступені параўнання якасных прыметнікаў, іх утварэнне і ўжыванне. Поўная і кароткая формы.

*Чытанне мастацкіх, навуковых і афіцыйных тэкстаў, вызначэнне ролі прыметнікаў у іх.*

***Кантрольны пісьмовы пераказ мастацкага тэксту з элементамі апісання рэчаў, жывёл або памяшкання.***

Скланенне якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў.

Асноўныя спосабы ўтварэння прыметнікаў. Прыметнікі з суфіксамі ацэнкі, сфера іх ужывання, правапіс. Прыметнікі з суфіксам -***ск***-, іх правапіс. Правапіс -***н-***, -***нн***- у прыметніках.

Утварэнне і правапіс складаных прыметнікаў. Правапіс ***не (ня)*** з прыметнікамі.

*Складанне апавяданняў з апісаннем рэчаў, жывёл або памяшкання.*

II. Чытаць тэксты розных стыляў, знаходзіць прыметнікі і апорныя словазлучэнні ў тэксце, утвараць і правільна ўжываць формы ступеней параўнання прыметнікаў *(смялейшы за ...*; *прыгажэйшы, чым ...*; *найсмялейшы з ...*; *самы смелы сярод ...);* правільна ўжываць прыметнікі ў спалучэннях з назоўнікамі, якія абазначаюць асоб мужчынскага і жаночага полу *(механік, заатэхнік, дырэктар),* у спалучэнні з назоўнікамі агульнага роду *(плакса, сірата)*; рабіць марфалагічны разбор прыметнікаў.

Вусна і пісьмова пераказваць мастацкія тэксты з апісаннем рэчаў, жывёл або памяшкання; складаць апавяданні з апісаннем рэчаў, жывёл або памяшкання.

## Лічэбнік

(14 гадзін, з іх 1 гадзіна — на пісьмовую работу)

I. Лічэбнік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Лічэбнікі колькасныя і парадкавыя, зборныя і дробавыя.

Паглыбленне паняцця пра разважанне: асаблівасці разгортвання думкі ў тэкстах-разважаннях.

*Падзел тэксту на сэнсавыя часткі, складанне плана.*

*Пераклад з рускай мовы на беларускую тэксту навуковага стылю з элементамі разважання.*

Простыя, складаныя і састаўныя колькасныя лічэбнікі, іх скланенне, ужыванне і правапіс.

Скланенне, ужыванне і правапіс парадкавых лічэбнікаў.

Скланенне, ужыванне і правапіс дробавых і зборных лічэбнікаў.

II. Чытаць тэксты розных стыляў, знаходзіць у іх лічэбнікі, правільна вымаўляць і пісаць лічэбнікі ад *адзінаццаці* да *дзе-*

*вятнаццаці*, а таксама *шэсцьдзяся́т, семдзесят, восемдзесят*; спалучаць з назоўнікамі лічэбнікі *два, дзве, двое, абодва, абедзве; тры, трое; чатыры, чацвёра; паўтара, паўтары*; правільна карыстацца лічэбнікамі пры абазначэнні даты, свята, прыблізнай колькасці; рабіць марфалагічны разбор лічэбнікаў.

Адрозніваць разважанне ад іншых тыпаў маўлення; аналізаваць тэксты-разважанні навуковага стылю; рабіць пераклад на беларускую мову тэкстаў навуковага стылю з элементамі разважання.

### Займеннік

(12 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Займеннік як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Пачатковая форма. Разрады займеннікаў па значэнні (знаёмства).

Паглыбленне паняцця пра апавяданне (асаблівасці разгортвання думкі ў ім).

*Чытанне апавядальных тэкстаў, знаходжанне ў іх займеннікаў і словазлучэнняў з займеннікамі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання.*

Складаны план.

*Падрабязны пісьмовы пераказ апавядальнага тэксту па складаным плане.*

Змяненне займеннікаў, іх утварэнне і правапіс.

***Кантрольны дыктант.***

II. Чытаць мастацкія тэксты, знаходзіць у іх займеннікі, выкарыстоўваць асабовыя займеннікі ў адпаведнасці з этычнымі нормамі; рабіць марфалагічны разбор займеннікаў.

Вусна і пісьмова пераказваць тэксты па складаным плане.

### Дзеяслоў

(26 гадзін, з іх 4 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Дзеяслоў як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Правапіс ***не (ня), ні*** з дзеясловамі.

Неазначальная форма дзеяслова, яе сінтаксічная роля.

Публіцыстычны стыль, яго жанры, сфера выкарыстання.

*Падрыхтоўка вусных і пісьмовых віншаванняў. Напісанне лістоў.*

Асабовыя, безасабовыя, зваротныя дзеясловы, іх ужыванне і правапіс канчаткаў.

*Знаходжанне ў апавядальных тэкстах асабовых, безасабовых і зваротных дзеясловаў, дзеяслоўных словазлучэнняў.*

Трыванні дзеяслова. Утварэнне і ўжыванне дзеясловаў закончанага і незакончанага трывання. Правапіс дзеясловаў з суфіксамі ***-ава- (-ява-), -ыва- (-іва-), -ва-, -оўва- (-ёўва-)***.

*Апісанне моўных з'яў, знаходжанне апісанняў у тэкстах навуковага стылю.*

***Кантрольны дыктант.***

Лады дзеяслова. Абвесны лад.

Часы дзеяслова, утварэнне і ўжыванне часавых формаў дзеяслова.

Змяненне дзеясловаў I і II спражэнняў. Разнаспрагальныя дзеясловы.

Патрабаванні да сціслага пераказу. *Сціслы пераказ апавядальных тэкстаў.*

Дзеясловы ўмоўнага і загаднага ладу, іх значэнне, утварэнне, ужыванне і правапіс.

Спосабы ўтварэння дзеясловаў.

***Кантрольны падрабязны пераказ апавядальнага тэксту.***

II. Знаходзіць у тэксце дзеясловы і дзеяслоўныя словазлучэнні; суадносіць дзеясловы з аднакаранёвымі словамі іншых часцін мовы; вызначаць сэнсава-граматычную ролю дзеясловаў у тэкстах; ужываць дзеясловы ў прамым і пераносным значэнні; карыстацца дзеясловамі-сінонімамі і дзеясловамі-антонімамі; правільна ўжываць у сказах дзеясловы прошлага часу пры назоўніках, якія абазначаюць прафесіі, пасады, званні; рабіць марфалагічны разбор дзеясловаў.

Пераказваць апавядальныя тэксты; рыхтаваць вусныя і пісьмовыя віншаванні, пісаць лісты; рабіць сціслы пераказ тэксту.

### Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год

(2 гадзіны)

### Рэзервовыя гадзіны

(2 гадзіны)

# VII КЛАС

**(70 гадзін на год, 2 гадзіны на тыдзень; з іх 14 гадзін — на пісьмовыя работы)**

## Валоданне літаратурнай мовай — асноўны паказчык культуры чалавека

(1 гадзіна)

I. Нормы сучаснай беларускай літаратурнай мовы. Маўленчы этыкет.

II. Адрозніваць нормы беларускай літаратурнай мовы і прытрымлівацца іх у вусным і пісьмовым маўленні.

## Паўтарэнне вывучанага ў V—VI класах

(3 гадзіны)

I. Тэкст, стылі і тыпы маўлення.

Назоўнік, прыметнік, займеннік, лічэбнік, дзеяслоў як часціны мовы, іх граматычныя прыметы.

*Аналіз тэкстаў навуковага, афіцыйнага, мастацкага і гутарковага стыляў. Абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання моўных сродкаў з улікам маўленчай сітуацыі.*

Будова слова. Словаўтварэнне вывучаных часцін мовы.

II. Вызначаць стыль і тып маўлення; называць прыметы, характэрныя для тэксту пэўнага стылю; знаходзіць у тэксце назоўнікі, прыметнікі, лічэбнікі, займеннікі, дзеясловы; вызначаць граматычныя прыметы, марфемную будову і спосаб утварэння вывучаных часцін мовы.

## Дзеепрыметнік

(14 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Дзеепрыметнік як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Скланенне поўных дзеепрыметнікаў, правапіс іх склонавых канчаткаў.

Дзеепрыметнікавы зварот, знакі прыпынку.

*Паглыбленне паняцця пра мастацкі і навуковы стылі. Чытанне тэкстаў, вызначэнне адрасата і мэты выказвання,*

*знаходжанне дзеепрыметнікаў і дзеепрыметнікавых зваротаў, вызначэнне іх сэнсава-граматычнай і стылістычнай ролі.*

***Кантрольны дыктант.***

Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне і ўжыванне. Правапіс суфіксаў дзеепрыметнікаў залежнага стану прошлага часу ***-н-, -ен-, -ан-, -т-***. Поўная і кароткая формы дзеепрыметніка. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у беларускай мове.

*Замена дзеепрыметнікаў і дзеепрыметнікавых зваротаў іншымі моўнымі сродкамі, выяўленне сэнсавых адрозненняў. Пераклад на беларускую мову тэкстаў з элементамі апісання знешнасці чалавека.*

Правапіс ***не (ня)*** з дзеепрыметнікамі.

*Мастацкае апісанне знешнасці чалавека. Сачыненне-апісанне знешнасці чалавека.*

II. Знаходзіць у тэксце дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты, вызначаць іх ролю ў тэкстах, правільна ўжываць дзеепрыметнікі цяперашняга і прошлага часу, інтанаваць сказы з дзеепрыметнікавымі зваротамі; замяняць дзеепрыметнікі і дзеепрыметнікавыя звароты іншымі моўнымі сродкамі; рабіць марфалагічны разбор дзеепрыметнікаў.

Перакладаць на беларускую мову тэксты з элементамі апісання знешнасці чалавека; складаць мастацкае апісанне знешнасці чалавека.

## Дзеепрыслоўе

(9 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Дзеепрыслоўе як асобая форма дзеяслова: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Правапіс ***не*** з дзеепрыслоўямі.

Дзеепрыслоўны зварот, знакі прыпынку.

Дзеепрыслоўі незакончанага і закончанага трывання, іх утварэнне і правапіс.

*Выбарачнае чытанне тэкстаў з мэтай адказу на пастаўленыя пытанні, выяўленне дзеепрыслоўяў і дзеепрыслоўных зваротаў, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання. Замена дзеепрыслоўных зваротаў іншымі сінтаксічнымі канструкцыямі, выяўленне сэнсавых адрозненняў.*

Патрабаванні да выбарачнага пераказу. *Выбарачны вусны і пісьмовы пераказ тэксту з дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі на аснове папярэдняй падрыхтоўкі.*

II. Знаходзіць у тэксце адказы на пастаўленыя пытанні; выяўляць у тэкстах дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты, абгрунтоўваць мэтазгоднасць ужывання; карыстацца сінанімічнымі варыянтамі; рабіць марфалагічны разбор дзеепрыслоўяў.

Рабіць выбарачны вусны і пісьмовы пераказ тэксту з дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі.

## Прыслоўе

(15 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Прыслоўе як часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Разрады прыслоўяў па значэнні (знаёмства).

Ступені параўнання прыслоўяў. Утварэнне формаў вышэйшай і найвышэйшай ступеней параўнання прыслоўяў, асаблівасці іх ужывання ў беларускай мове.

*Пераклад на беларускую мову тэксту мастацкага стылю з элементамі апісання пэўнай мясцовасці.*

Утварэнне прыслоўяў. Правапіс прыслоўяў разам, праз дэфіс. Правапіс спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў.

Правапіс ***не (ня), ні*** з прыслоўямі.

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

*Сачыненне-апісанне вёскі (горада, мікрараёна) з мэтай перадачы сваіх адносін да родных мясцін («Ліст да сябра»).*

II. Знаходзіць у тэксце прыслоўі, вызначаць іх сэнсава-граматычную і стылістычную ролю, спосаб утварэння; правільна пісаць прыслоўі, карыстацца формамі ступеней параўнання прыслоўяў як сінонімамі; выкарыстоўваць прыслоўе як сродак арганізацыі тэксту; рабіць марфалагічны разбор прыслоўяў.

Перакладаць на беларускую мову і ствараць уласныя тэксты з элементамі апісання пэўнай мясцовасці; рабіць падрабязны пераказ тэксту.

## Службовыя часціны мовы і выклічнік

(1 гадзіна)

## Прыназоўнік

(7 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Прыназоўнік як службовая часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Асноўныя значэнні прыназоўнікаў (знаёмства).

Невытворныя і вытворныя прыназоўнікі.

Прыназоўнікі простыя, складаныя і састаўныя, іх ужыванне і правапіс.

Паглыбленне паняцця пра разважанне як тып маўлення.

*Удзел у дыспуце на тэму «Каго можна назваць сапраўдным сябрам» (на аснове адной крыніцы). Напісанне нататкі пра дыспут у газету.*

***Кантрольны дыктант з дадатковымі заданнямі.***

II. Адрозніваць вытворныя прыназоўнікі ад самастойных часцін мовы. Правільна ўжываць прыназоўнікі ў маўленні, у тым ліку прыназоўнікі ***з (са), у (ва), па, згодна з, дзякуючы, падобна, адпаведна*** і інш; выкарыстоўваць спецыфічныя для беларускай мовы спалучэнні прыназоўнікаў з назоўнікамі, займеннікамі (у тым ліку пры перакладзе з рускай мовы); рабіць марфалагічны разбор прыназоўнікаў.

Пісаць нататку ў газету.

## Злучнік

(6 гадзін, з іх 1 гадзіна — на пісьмовую работу)

I. Злучнік як службовая часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

*Аналіз тэкстаў (у тым ліку на лінгвістычную тэму), вызначэнне ролі злучнікаў у іх.*

Простыя і састаўныя злучнікі, іх ужыванне.

Злучальныя і падпарадкавальныя злучнікі, іх ужыванне.

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту мастацкага стылю.***

Адзіночныя, парныя, паўторныя злучнікі, іх ужыванне і правапіс.

*Падзел тэкстаў на сказы з пастаноўкай знакаў прыпынку. Складанне сказаў, тэкстаў са злучальнымі і падпарадкавальнымі злучнікамі.*

II. Знаходзіць злучнікі ў тэкстах, вызначаць іх ролю; дзяліць тэкст на сказы, расстаўляючы знакі прыпынку; ужываць злучнікі ў сказах з аднароднымі членамі, у складаных сказах і для сувязі сказаў і частак тэксту; правільна выбіраць злучнікі (у адпаведнасці са значэннем і стылістычнай афарбоўкай), ужываць іх у маўленні; складаць тэксты з ужываннем розных злучнікаў; карыстацца паўторам злучніка з мэтай узмацнення выразнасці маўлення; рабіць марфалагічны разбор злучнікаў.

Рабіць падрабязны пераказ тэксту мастацкага стылю.

## Часціца

(8 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Часціца як службовая часціна мовы: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Асноўныя значэнні часціц (знаёмства). Формаўтваральныя часціцы.

Правапіс часціц.

Часціцы ***не, ні,*** іх адрозненне. Правапіс ***не (ня), ні*** з рознымі часцінамі мовы (паўтарэнне).

*Падрабязны, сціслы і выбарачны пераказ аднаго і таго тэксту. Пісьмовы падрабязны (сціслы або выбарачны) пераказ тэксту.*

II. Знаходзіць часціцы ў тэксце, вызначаць іх ролю; складаць з імі сказы, ужываць у маўленні; захоўваць правільную інтанацыю пры чытанні сказаў з часціцамі; карыстацца часціцамі як сродкам сувязі сказаў у тэксце; рабіць марфалагічны разбор часціцы.

Рабіць падрабязны (сціслы або выбарачны) пераказ тэксту.

## Выклічнік

(2 гадзіны, з іх 1 гадзіна — на пісьмовую работу)

I. Выклічнік як часціна мовы. Дэфіс у выклічніках. Інтанаванне сказаў з выклічнікамі, знакі прыпынку. Выклічнік і маўленчы этыкет.

***Кантрольны дыктант з дадатковымі заданнямі.***

II. Знаходзіць выклічнікі ў тэксце, вызначаць іх ролю; правільна чытаць сказы з выклічнікамі, самастойна складаць новыя; ужываць выклічнікі ў маўленні.

### Пераход слоў з адной часціны мовы ў іншую

(1 гадзіна)

### Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год

(2 гадзіны)

### Рэзервовая гадзіна

(1 гадзіна)

## VIII КЛАС

**(70 гадзін на год, 2 гадзіны на тыдзень;
з іх 14 гадзін — на пісьмовыя работы)**

### Роля беларускай мовы ў развіцці нацыянальнай культуры

(1 гадзіна)

### Паўтарэнне вывучанага ў V—VII класах

(2 гадзіны)

I. Тэкст як сэнсава-граматычнае адзінства. Стылі і тыпы маўлення (паглыбленне).

*Чытанне тэкстаў, вызначэнне іх тэмы, адрасата, мэтанакіраванасці і стылістычнай прыналежнасці.*

Самастойныя і службовыя часціны мовы. Правапіс ***не (ня), ні*** з рознымі часцінамі мовы.

II. Называць асноўныя прыметы тэксту, вызначаць яго стыль і тып. Знаходзіць у тэксце самастойныя і службовыя часціны мовы, рабіць іх марфалагічны разбор, правільна ўжываць у маўленні.

### Сінтаксіс і пунктуацыя

(1 гадзіна)

### Словазлучэнне: будова, значэнне, ужыванне

(5 гадзін, з іх 1 гадзіна — на пісьмовую работу)

I. Словазлучэнне як сінтаксічная адзінка. Граматычнае значэнне словазлучэння. Віды сінтаксічнай сувязі слоў у слова-

злучэнні: дапасаванне, кіраванне, прымыканне. Непадзельныя словазлучэнні. Асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове (у параўнанні з рускай).

*Класіфікацыя словазлучэнняў. Разгортванне словазлучэнняў, іх выкарыстанне пры апісанні прадметаў, людзей, з'яў. Пераклад сказаў (тэкстаў) з адметнымі беларускімі словазлучэннямі.*

Паглыбленне вывучанага пра навуковы і афіцыйны стылі маўлення.

*Знаходжанне апорных словазлучэнняў у тэкстах, вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі.*

*Пераказ тэксту навуковага стылю з выкарыстаннем апорных словазлучэнняў.*

II. Знаходзіць словазлучэнні ў тэксце; вызначаць галоўнае слова, групаваць словазлучэнні паводле будовы і значэння; ствараць і разгортваць словазлучэнні з рознымі відамі сінтаксічнай сувязі; перакладаць сказы (тэксты) з адметнымі беларускімі словазлучэннямі; адрозніваць свабодныя словазлучэнні ад несвабодных; дакладна перадаваць змест прачытанага тэксту з выкарыстаннем апорных словазлучэнняў; выконваць сінтаксічны разбор словазлучэнняў.

## ПРОСТЫ СКАЗ

### Двухсастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

(20 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Сказ як асноўная камунікатыўная адзінка. Тыпы сказаў паводле мэты выказвання і інтанацыйнага афармлення (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; клічныя і няклічныя сказы) (паўтарэнне). Простыя і складаныя сказы. Развітыя і неразвітыя сказы.

Парадак слоў у сказе. Лагічны націск. Інтанаванне сказаў.

*Чытанне маналагічных і дыялагічных тэкстаў; падзел дэфармаваных тэкстаў на сказы, вызначэнне тыпу сказаў па мэце выказвання і інтанацыі. Вызначэнне меж сказаў.*

*Знаходжанне сказаў, якія выражаюць галоўную думку ў тэксце, і тых, якія яе паясняюць.*

*Падрыхтоўка паведамлення на маральна-этычную тэму на аснове дзвюх-трох крыніц.*

***Кантрольны дыктант з дадатковымі заданнямі.***

Двухсастаўныя сказы. Дзейнік і выказнік, сэнсава-граматычныя адносіны паміж імі.

Спосабы выражэння дзейніка. Спосабы выражэння выказніка (простага дзеяслоўнага, састаўнога дзеяслоўнага і састаўнога іменнага) (знаёмства). Сувязь выказніка і дзейніка, выражанага колькасна-іменным спалучэннем. Працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам.

*Пераказ зместу кінафільмаў, урыўкаў з мастацкіх твораў, радыё- і тэлеперадач з выкарыстаннем двухсастаўных сказаў.*

Даданыя члены сказа: азначэнне, дапаўненне, акалічнасць, іх граматычнае значэнне, роля ў сказе. Спосабы выражэння даданых членаў сказа. Прыдатак як разнавіднасць азначэння.

*Перабудова неразвітых двухсастаўных сказаў у развітыя.*

Паглыбленне паняцця пра паслядоўную і паралельную сувязь сказаў у тэксце.

*Чытанне і аналіз мастацкіх тэкстаў, вызначэнне ў іх сродкаў эмацыянальна-экспрэсіўнай выразнасці; спосабаў і сродкаў сувязі частак і сказаў. Складанне двухсастаўных развітых сказаў на тэмы, звязаныя з працай людзей розных прафесій; напісанне тэкстаў на аснове складзеных сказаў.*

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

II. Дзяліць дэфармаваны тэкст на сказы і абазначаць іх межы; вызначаць сказы, якія выражаюць галоўную думку ў тэксце, і тыя, якія яе паясняюць; правільна інтанаваць апавядальныя, пытальныя і пабуджальныя сказы.

Знаходзіць двухсастаўныя неразвітыя сказы ў тэкстах; рабіць сінтаксічны разбор двухсастаўных неразвітых сказаў.

Правільна далучаць выказнік да дзейніка; пераказваць змест радыё- і тэлеперадач; ствараць паведамленне на маральна-этычную тэму.

Адрозніваць развітыя сказы ад неразвітых, вызначаць мэтазгоднасць ужывання іх у тэксце; знаходзіць галоўныя і даданыя члены сказа; характарызаваць найбольш пашыраныя спосабы выражэння дзейніка і выказніка, вызначаць простыя дзеяслоўныя, састаўныя дзеяслоўныя і састаўныя іменныя выказнікі; ставіць працяжнік паміж дзейнікам і выказнікам; складаць

двухсастаўныя развітыя сказы на тэмы, звязаныя з працай людзей розных прафесій, аб'ядноўваць іх у тэксты з дапамогай паслядоўнай і паралельнай сувязі; вызначаць у тэкстах сродкі эмацыянальна-экспрэсіўнай выразнасці; рабіць сінтаксічны разбор двухсастаўных развітых сказаў.

### Аднасастаўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

(10 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Аднасастаўныя сказы, іх віды: пэўна-асабовыя, няпэўна-асабовыя, абагульнена-асабовыя, безасабовыя сказы.

Назыўныя сказы, іх ужыванне.

Паглыбленне паняцця пра публіцыстычны стыль.

*Знаходжанне ў тэкстах аднасастаўных развітых і неразвітых сказаў, вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання. Замена двухсастаўных сказаў сінанімічнымі аднасастаўнымі. Пераклад з рускай мовы на беларускую мастацкага тэксту з апісаннем з'яў прыроды.*

***Кантрольны дыктант з дадатковымі заданнямі.***

II. Знаходзіць у тэкстах двухсастаўныя і аднасастаўныя сказы, адрозніваць іх па асноўных прыметах; ствараць вусныя і пісьмовыя разважанні з ужываннем аднасастаўных сказаў розных відаў; перакладаць тэксты з апісаннем з'яў прыроды; рабіць сінтаксічны разбор аднасастаўных сказаў.

### Няпоўныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

(3 гадзіны)

I. Няпоўныя сказы. Асаблівасці іх будовы, ужыванне, інтанаванне. Працяжнік у няпоўным сказе.

*Параўнальны аналіз маналагічных і дыялагічных тэкстаў, вызначэнне сродкаў моўнай выразнасці.*

*Абмеркаванне пэўнай падзеі ў форме дыялога.*

II. Знаходзіць у тэкстах няпоўныя сказы, вызначаць іх будову, мэтазгоднасць ужывання; адрозніваць няпоўныя сказы ад поўных аднасастаўных; карыстацца няпоўнымі сказамі ў маналагічным і дыялагічным маўленні; рабіць сінтаксічны разбор няпоўных сказаў; афармляць няпоўныя сказы на пісьме ў адпаведнасці з пунктуацыйнымі нормамі.

## УСКЛАДНЕНЫ СКАЗ

### Сказы з аднароднымі членамі: будова, значэнне, ужыванне

(7 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Паняцце пра ўскладнены сказ. Сказы з аднароднымі членамі. Спосабы выражэння аднародных членаў. Сувязь аднародных членаў пры дапамозе злучнікаў і без злучнікаў. Аднародныя і неаднародныя азначэнні, іх адрозненне. Інтанаванне сказаў з аднароднымі членамі, знакі прыпынку ў іх.

Сказы з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах, інтанаванне, знакі прыпынку.

Паглыбленне паняцця пра апісанне як тып маўлення.

*Аналіз навуковых тэкстаў з апісаннямі. Вызначэнне сэнсава-стылістычнай ролі сказаў з аднароднымі членамі, у тым ліку з абагульняльнымі словамі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання.*

*Водгук на празаічны або вершаваны твор.*

***Кантрольная тэставая работа.***

II. Вызначаць сказы з аднароднымі членамі, звязанымі спалучальнымі, супраціўнымі і размеркавальнымі злучнікамі, у тым ліку сказы з абагульняльнымі словамі пры аднародных членах, правільна афармляць іх на пісьме; выкарыстоўваць сказы з аднароднымі членамі пры стварэнні пісьмовых тэкстаў; пісаць водгук на празаічны або вершаваны твор; рабіць сінтаксічны разбор сказаў з аднароднымі членамі.

### Сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі. Словы-сказы: будова, значэнне, ужыванне

(5 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Зваротак. Спосабы выражэння звароткa. Неразвітыя і развітыя звароткі, інтанаванне, знакі прыпынку. Зваротак як сродак маўленчага этыкету.

Пабочныя словы, словазлучэнні і сказы, устаўныя канструкцыі. Іх значэнне і роля ў сказе, інтанаванне і знакі прыпынку.

***Кантрольны падрабязны пераказ апавядальнага тэксту з элементамі разважання.***

Словы-сказы.

*Чытанне лістоў знакамітых людзей, знаходжанне сказаў са звароткамі, пабочнымі словамі і выклічнікамі. Вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання.*

*Напісанне віншаванняў, афіцыйных пісьмаў і сяброўскіх лістоў.*

II. Вызначаць сказы са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі, правільна інтанаваць іх, ужываць пры стварэнні вусных і пісьмовых тэкстаў розных стыляў, афармляць на пісьме; карыстацца пабочнымі словамі як сродкамі сувязі сказаў і частак тэксту; пераказваць апавядальныя тэксты з элементамі разважання; пісаць лісты, у тым ліку афіцыйныя пісьмы; рабіць сінтаксічны разбор сказаў са звароткамі, пабочнымі словамі, устаўнымі канструкцыямі і выклічнікамі.

### Сказы з адасобленымі членамі: будова, значэнне, ужыванне

(9 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Паняцце пра адасабленне. Адасобленыя дапасаваныя і недапасаваныя азначэнні.

Сказы з адасобленымі прыдаткамі, знакі прыпынку.

Сказы з адасобленымі дапаўненнямі, іх інтанаванне, знакі прыпынку.

Сказы з адасобленымі акалічнасцямі, іх інтанаванне, знакі прыпынку.

*Аналіз і пераказ мастацкіх тэкстаў на гістарычную тэму. Вызначэнне сэнсава-стылістычнай ролі адасобленых членаў сказа, абгрунтаванне мэтазгоднасці іх ужывання. Выяўленне апісання гістарычнай падзеі ў тэксце. Пераклад на беларускую мову тэкстаў гістарычнай тэматыкі з элементамі апісання.*

Сказы з адасобленымі ўдакладняльнымі членамі, іх інтанаванне, знакі прыпынку.

*Сачыненне-апісанне помніка гісторыі (культуры).*

II. Знаходзіць у тэкстах сказы з адасобленымі членамі, карыстацца імі ў вусных і пісьмовых выказваннях, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку; перакладаць на беларускую мову тэксты гістарычнай тэматыкі; ствараць сачыненне-апісанне помніка гісторыі (культуры); рабіць сінтаксічны разбор сказаў з адасобленымі членамі.

### Сказы з параўнальнымі зваротамі

(3 гадзіны, з іх 1 гадзіна — на пісьмовую работу)

I. Параўнальны зварот, спосабы выражэння параўнання. Знакі прыпынку пры параўнальных зваротах.

*Знаходжанне ў сказах і тэкстах параўнальных зваротаў, вызначэнне іх ролі ў маўленні.*

***Кантрольны дыктант.***

II. Знаходзіць сказы з параўнальнымі зваротамі, ужываць іх пры стварэнні вусных і пісьмовых выказванняў, правільна інтанаваць і ставіць знакі прыпынку; адрозніваць параўнальныя звароты ад аманімічных сінтаксічных канструкцый.

### Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год

(2 гадзіны)

### Рэзервовыя гадзіны

(2 гадзіны)

## IX КЛАС

**(70 гадзін на год, 2 гадзіны на тыдзень; з іх 14 гадзін — на пісьмовыя работы)**

### Беларуская мова ў сям'і славянскіх моў і моў народаў свету

(1 гадзіна)

### Паўтарэнне вывучанага ў V—VIII класах

(4 гадзіны)

I. Паўтарэнне вывучанага пра тэкст, стылі і тыпы маўлення.

*Падзел тэкстаў на сказы і лагічныя часткі. Знаходжанне сказаў, якія выражаюць асноўны сэнс паведамлення і якія яго пашыраюць. Разгортванне сэнсу частак тэксту шляхам далучэння самастойна складзеных сказаў. Увядзенне ў тэкст новых частак.*

*Вызначэнне тэмы, адрасата і мэтанакіраванасці выказванняў, знаходжанне ў іх апорных слоў і словазлучэнняў.*

Слова, словазлучэнне, сказ як асноўныя моўныя адзінкі. Тыпы простых сказаў па мэце выказвання, інтанацыйным афармленні (апавядальныя, пытальныя, пабуджальныя; клічныя і няклічныя) і будове (двухсастаўныя і аднасастаўныя, поўныя і няпоўныя, ускладненыя).

*Чытанне і аналіз тэкстаў розных стыляў і жанраў, выяўленне ў іх двухсастаўных, аднасастаўных, няпоўных і ўскладненых сказаў, вызначэнне іх сэнсава-стылістычнай ролі.*

II. Знаходзіць у тэкстах сказы, якія выражаюць асноўную думку паведамлення, разгортваць словазлучэнні і сказы. Ставіць знакі прыпынку ў сказах ускладненай будовы. Вызначаць тып тэкстаў, выяўляць у іх апорныя словы і словазлучэнні, сродкі сувязі сказаў і лагічных частак; ствараць выказванні з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў, пашыраць тэксты; рабіць сінтаксічны разбор простых сказаў.

### Складаны сказ: будова, значэнне, ужыванне

(4 гадзіны, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Паняцце пра складаны сказ. Сродкі сувязі частак у складаных сказах. Тыпы складаных сказаў.

*Аналіз тэкстаў-разважанняў публіцыстычнага стылю. Вызначэнне адрасата, тэмы, асноўнай думкі, асаблівасцей будовы і стылістычных прымет; падзел на лагічныя часткі, знаходжанне ў тэкстах складаных сказаў, вызначэнне сродкаў сінтаксічнай сувязі граматычных частак.*

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

II. Знаходзіць у тэкстах складаныя сказы розных тыпаў; вызначаць тэксты-разважанні публіцыстычнага стылю, вызначаць іх адрасата і мэтанакіраванасць, дзяліць на лагічныя часткі; ставіць знакі прыпынку на мяжы частак складаных сказаў; будаваць складаныя сказы розных тыпаў; пераказваць тэксты публіцыстычнага стылю.

### Складаназлучаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

(7 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Паняцце пра складаназлучаны сказ. Сродкі сувязі частак у складаназлучаных сказах. Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаназлучаных сказах.

*Пераклад тэкстаў лінгвістычнай тэматыкі з рускай мовы на беларускую.*

Сінанімічнасць складаназлучаных і простых сказаў.

*Перабудова простых сказаў з аднароднымі выказнікамі ў складаназлучаныя, складаназлучаных — у простыя. Інтанаванне тэкстаў са складаназлучанымі сказамі. Вызначэнне ролі складаназлучаных сказаў у тэкстах.*

***Кантрольны дыктант.***

*Падрыхтоўка вусных і пісьмовых паведамленняў на лінгвістычную тэму з апісаннем моўных з'яў.*

II. Знаходзіць складаназлучаныя сказы ў тэкстах, правільна інтанаваць, абгрунтоўваць мэтазгоднасць ужывання; будаваць складаназлучаныя сказы, выкарыстоўваць іх у самастойных вусных і пісьмовых выказваннях, ставіць знакі прыпынку на мяжы частак; рыхтаваць пісьмовыя паведамленні з апісаннем моўных з'яў; рабіць сінтаксічны разбор складаназлучаных сказаў.

### Складаназалежныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

(15 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Паняцце пра складаназалежны сказ.

Складаназалежныя сказы з даданымі азначальнай, дапаўняльнай часткамі, акалічнаснымі часткамі месца, часу, умовы, прычыны, мэты, уступальнымі, параўнальнымі, спосабу дзеяння, меры і ступені (сродкі сувязі, знакі прыпынку).

*Чытанне тэкстаў, назіранне за парадкам частак у складаназалежных сказах, вызначэнне меж галоўнай і даданай частак, месца даданай часткі адносна галоўнай, інтанаванне і пастаноўка знакаў прыпынку.*

Складаназалежныя сказы з некалькімі даданымі часткамі.

Складаназалежныя сказы з паслядоўным, сузалежным і змешаным падпарадкаваннем частак, знакі прыпынку ў іх.

*Аналіз публіцыстычных тэкстаў, вызначэнне іх жанру (нататка, інтэрв'ю, рэпартаж, нарыс), адрасата, мэтанакіраванасці, будовы, стылістычных прымет. Перабудова простых сказаў з адасобленымі даданымі членамі ў складаназалежныя.*

*Пераклад з рускай мовы на беларускую тэксту публіцыстычнага стылю.*

***Кантрольны дыктант з дадатковымі заданнямі.***

ІІ. Знаходзіць у тэкстах складаназалежныя сказы з азначальнымі, дапаўняльнымі, акалічнаснымі часткамі; будаваць складаназалежныя сказы, выкарыстоўваць іх у вусным і пісьмовым маўленні, ставіць знакі прыпынку на мяжы частак; адрозніваць публіцыстычныя жанры (інтэрв'ю, рэпартаж, нарыс); перакладаць тэксты публіцыстычнага стылю; удасканальваць свой і чужы тэксты; рабіць сінтаксічны разбор складаназалежных сказаў.

## Бяззлучнікавыя складаныя сказы: будова, значэнне, ужыванне

(12 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

І. Паняцце пра бяззлучнікавы складаны сказ (будова, сэнсава-граматычныя адносіны паміж часткамі, сродкі сувязі частак). Знакі прыпынку паміж часткамі ў бяззлучнікавых складаных сказах.

*Складанне бяззлучнікавых складаных сказаў рознай тэматыкі, іх інтанаванне, уключэнне ў тэксты ўласных паведамленняў. Перабудова бяззлучнікавых складаных сказаў у простыя, складаназлучаныя і складаназалежныя, складаназлучаных і складаназалежных — у бяззлучнікавыя.*

*Аналіз мастацкіх тэкстаў: вызначэнне адрасата і адрасанта, тэмы паведамлення, мэтанакіраванасці, характарыстыка выяўленчых моўных сродкаў; абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання бяззлучнікавых складаных сказаў.*

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

ІІ. Знаходзіць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў тэкстах, вызначаць сінтаксічныя адносіны паміж часткамі, інтанаваць сказы ў адпаведнасці з сэнсам, ставіць знакі прыпынку на мяжы частак; ужываць бяззлучнікавыя складаныя сказы ў вусным і пісьмовым маўленні; выконваць сінанімічныя замены сказаў розных відаў; рабіць сінтаксічны разбор бяззлучнікавых складаных сказаў.

## Складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак: будова, значэнне, ужыванне

(10 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Паняцце пра складаны сказ з рознымі відамі сувязі частак (іх разнавіднасці, сінтаксічныя прыметы, сродкі сувязі, інтанаванне і выкарыстанне). Знакі прыпынку паміж часткамі ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак.

*Знаходжанне складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак у тэкстах, складанне сказаў і ўвядзенне іх у тэкст. Перабудова складаных сказаў з рознымі відамі сувязі частак у простыя, складаназлучаныя, складаназалежныя і бяззлучнікавыя.*

*Аналіз біяграфій беларускіх пісьменнікаў ці лінгвістаў. Вызначэнне паслядоўнасці развіцця думкі ў залежнасці ад жанру і стылю тэкстаў. Абгрунтаванне мэтазгоднасці выкарыстання выяўленчых моўных сродкаў, у тым ліку сказаў з рознымі відамі сувязі частак. Напісанне заявы, аўтабіяграфіі.*

***Кантрольная тэставая работа.***

II. Знаходзіць у тэкстах складаныя сказы з рознымі відамі сувязі частак, абгрунтоўваць мэтазгоднасць іх ужывання, складаць такія сказы, карыстацца імі ў маўленні, ставіць знакі прыпынку на мяжы частак; перабудоўваць сказы з рознымі відамі сувязі частак у сказы іншай граматычнай структуры; рабіць сінтаксічны разбор сказаў з рознымі відамі сувязі частак; пісаць заяву, аўтабіяграфію.

## Сінтаксічныя канструкцыі з чужой мовай: будова, значэнне, ужыванне

(9 гадзін, з іх 1 гадзіна — на пісьмовую работу)

I. Спосабы перадачы чужой мовы.

Асаблівасці будовы сінтаксічных канструкцый з простай мовай, іх інтанаванне і выкарыстанне. Знакі прыпынку ў сказах з простай мовай.

Маналог. Дыялог, яго афармленне на пісьме.

Сказы з ускоснай мовай.

*Аналіз публіцыстычных, мастацкіх і навуковых тэкстаў, вызначэнне ў іх чужой мовы, абгрунтаванне мэтазгоднасці*

*ўжывання і спосабаў перадачы. Замена ў тэкстах простай мовы на ўскосную і наадварот. Стварэнне тэкстаў (маналогаў і дыялогаў), іх інтанаванне.*

Цытаты, іх роля ў выказванні, афармленне на пісьме. Эпіграф.

*Падрыхтоўка тэкстаў дыскусійных выступленняў з цытаваннем першакрыніц.*

***Кантрольны дыктант.***

II. Знаходзіць у тэкстах канструкцыі з простай і ўскоснай мовай, інтанаваць іх, вызначаць асаблівасці будовы, выкарыстоўваць у маўленні, ставіць знакі прыпынку; карыстацца цытатамі ў адпаведнасці з мэтай і характарам выказвання; замяняць простую мову ўскоснай і наадварот.

### Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага за год

(6 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Сінтаксіс як раздзел граматыкі, яго асноўныя адзінкі і іх характарыстыка. Узаемасувязь сінтаксісу, лексікі і марфалогіі.

Нормы літаратурнага вымаўлення. Паўтарэнне складаных пытанняў арфаграфіі і пунктуацыі.

*Пераклад навукова-папулярных тэкстаў.*

*Складанне плана паведамлення, тэзісаў, канспекта; выступленне з дакладам; абмеркаванне выступленняў.*

II. Складаць план, тэзісы, канспект, выступаць перад аўдыторыяй; аналізаваць уласнае і чужое выказванне; перакладаць навукова-папулярныя тэксты з рускай мовы на беларускую.

### Рэзервовыя гадзіны

(2 гадзіны)

## X КЛАС

**(53 гадзіны на год, 1 гадзіна на тыдзень у I паўгоддзі, 2 гадзіны — у II паўгоддзі; з іх 9 гадзін — на пісьмовыя работы)**

### Роля роднай мовы ў жыцці чалавека і грамадства

(1 гадзіна)

## Маўленне

(14 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Маўленне як працэс маўленчых зносін. Умовы маўленчых зносін.

Віды маўленчай дзейнасці, іх роля ў фарміраванні асобы. Вуснае і пісьмовае, дыялагічнае і маналагічнае маўленне.

Тэкст як адзінка мовы і маўлення. Сэнсавая цэласнасць і тэматычнае адзінства тэксту, разгорнутасць, паслядоўнасць, звязнасць, завершанасць тэксту.

*Пісьмовая творчая работа.*

Стылі маўлення (навуковы, афіцыйны, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы): сфера выкарыстання, мэта выказвання, стылявыя рысы, характэрныя моўныя сродкі, жанравыя разнавіднасці.

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

II. Размяжоўваць вуснае і пісьмовае, маналагічнае і дыялагічнае маўленне; даваць характарыстыку маўленчай сітуацыі. Вызначаць адрасата і мэтанакіраванасць тэксту; выяўляць прыметы тэксту, вызначаць тэму і асноўную думку, даваць загаловак, дзяліць тэкст на часткі (падтэмы і мікратэмы) і абзацы; вызначаць спосаб і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце, выдзяляць апорныя (ключавыя) словы, словазлучэнні, сказы. Аналізаваць тэксты розных тыпаў маўлення, складаць іх схемы. Абгрунтоўваць прыналежнасць тэкстаў да пэўнага стылю, выяўляць асаблівасці ўжывання моўных сродкаў у тэкстах розных стыляў і жанраў; удасканальваць тэксты рознай стылістычнай прыналежнасці з мэтай захавання стылявога адзінства.

Адэкватна ўспрымаць вуснае і пісьмовае маўленне, валодаць навыкамі чытання тэкстаў розных стыляў услых і самому сабе, весці дыялог у сітуацыі афіцыйных і неафіцыйных маўленчых зносін. Складаць просты і складаны план тэксту, вусна і пісьмова пераказваць тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

## Слова ў тэксце

(19 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Гукавая абалонка слова. Стылістычныя магчымасці фанетыкі.

Лексічнае значэнне слова. Стылістычныя магчымасці лексікі і фразеалогіі.

Марфемная будова слова, утварэнне слоў. Стылістычныя магчымасці словаўтварэння.

***Кантрольны дыктант.***

Назоўнік, прыметнік, лічэбнік, займеннік, дзеяслоў (дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе), прыслоўе: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля. Прыназоўнік, злучнік, часціца, выклічнік: агульнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля. Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці слоў і іх формаў.

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

II. Ведаць марфалагічныя прыметы пэўнай часціны мовы і сінтаксічную ролю ў словазлучэннях і сказах, ролю розных часцін мовы ў арганізацыі маўлення, разгортванні і стварэнні тэкстаў розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Знаходзіць пэўныя моўныя адзінкі ў тэкстах; вызначаць асаблівасці іх ужывання ў тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў; карыстацца стылістычнымі магчымасцямі фанетыкі, лексікі, фразеалогіі і словаўтварэння; мэтанакіравана і свядома ўжываць у вусным і пісьмовым маўленні моўныя адзінкі з улікам пэўнай камунікатыўнай задачы; ствараць самастойныя тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці з улікам сэнсава-стылістычнай ролі і тэкстаўтваральных магчымасцей слоў розных часцін мовы.

## Словазлучэнне і сказ у тэксце

(15 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

I. Словазлучэнне; віды, спосабы і сродкі сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні. Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці словазлучэнняў у разгортванні тэмы, афармленні звязнага выказвання. Сінаніміка словазлучэнняў, яе роля ў стварэнні тэкстаў рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

*Пісьмовая творчая работа.*

Сутнасць сказа як цэласнай сінтаксічнай адзінкі. Асноўныя функцыі сказа. Сінтаксічныя прыметы двухсастаўных і аднаса-

стаўных сказаў, няпоўных сказаў, сказаў з аднароднымі і адасобленымі членамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, звароткамі; знакі прыпынку. Сінтаксічныя прыметы складаназлучаных, складаназалежных, бяззлучнікавых складаных сказаў і сказаў з рознымі відамі сувязі частак; знакі прыпынку.

***Кантрольны дыктант.***

Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці простых і складаных сказаў рознай будовы і прызначэння.

Сінтаксічная сінаніміка.

***Кантрольная тэставая работа.***

II. Вызначаць сінтаксічныя прыметы і асаблівасці будовы сказаў розных відаў; ведаць пунктуацыйныя нормы пры пісьмовым афармленні сказаў; вызначаць сэнсава-стылістычную ролю словазлучэнняў і сказаў рознай будовы і прызначэння; абгрунтоўваць мэтазгоднасць ужывання сінтаксічных канструкцый у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў.

Ствараць самастойныя тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

### Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага

(2 гадзіны)

### Рэзервовыя гадзіны

(2 гадзіны)

## XI КЛАС

**(53 гадзіны на год, 2 гадзіны на тыдзень у I паўгоддзі, 1 гадзіна — у II паўгоддзі; з іх 9 гадзін — на пісьмовыя работы)**

### Культура вуснага і пісьмовага маўлення

(2 гадзіны)

I. Асноўныя якасці культуры маўлення. Маўленчы этыкет, асноўныя правілы маўленчых паводзін.

*Падрыхтоўка віншавальнага прывітання.*

II. Ведаць асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення; правілы маўленчых паводзін у пэўных маўленчых сітуацыях, формулы маўленчага этыкету.

Ужываць згодна з маўленчай сітуацыяй і зместам камунікацыі моўныя сродкі для наладжвання неканфліктных, добразычлівых і паспяховых узаемаадносін; захоўваць і ўдасканальваць культуру маўленчых паводзін, дарэчы карыстацца нацыянальным маўленчым этыкетам.

### Правільнасць маўлення

(40 гадзін, з іх 6 гадзін — на пісьмовыя работы)

I. Паняцце літаратурнай нормы. Зменлівасць нормаў. Варыянтнасць у маўленні.

Арфаэпічныя нормы: вымаўленне галосных і зычных гукаў, некаторых спалучэнняў зычных. Акцэнталагічныя нормы. Лагічны націск. Арфаграфічныя нормы: напісанні, заснаваныя на фанетычным прынцыпе; напісанні, заснаваныя на марфалагічным прынцыпе; правапіс мяккага знака і апострафа, малой і вялікай літар; правілы напісання слоў разам, праз злучок і асобна.

***Кантрольны дыктант.***

Марфалагічныя нормы: ужыванне і правапіс назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, займеннікаў, дзеясловаў, дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў, прыслоўяў.

*Пераклад тэксту з рускай мовы на беларускую.*

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

Сінтаксічныя нормы: правілы дапасавання і кіравання, спалучэння аднародных і адасобленых членаў, парадак слоў, сувязь дзейніка і выказніка ў сказе, правілы ўжывання дзеепрыслоўных зваротаў, пабудовы складаных сказаў.

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

Пунктуацыйныя нормы: знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі, адасобленымі членамі, параўнальнымі зваротамі, з пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, звароткамі; знакі прыпынку ў складаназлучаных, складаназалежных, бяззлучнікавых складаных сказах, у сказах з рознымі відамі сувязі частак, у канструкцыях з простай мовай.

***Кантрольны дыктант.***

II. Захоўваць літаратурныя нормы ў вусным і пісьмовым маўленні.

Знаходзіць і выпраўляць маўленчыя недахопы і парушэнні нормаў літаратурнай мовы ў чужым і ўласным маўленні, устанаўліваць прычыны парушэння нормаў.

### Дакладнасць і лагічнасць маўлення

(1 гадзіна)

I. Ужыванне слоў, фразеалагізмаў з уласцівым ім значэннем. Дарэчнае ўжыванне дыялектызмаў, іншамоўных слоў.

Асноўныя правілы лагічнасці маўлення.

II. Ведаць сінанімію, стылістычную дыферэнцыяцыю слоў-сінонімаў, мнагазначнасць слоў і фразеалагізмаў, словы-паронімы. Захоўваць лексічныя нормы ва ўласным маўленні; знаходзіць і выпраўляць лексічныя памылкі; правільна выкарыстоўваць фразеалагізмы ў пэўным кантэксце.

Ведаць асноўныя правілы лагічнасці маўлення, карыстацца лінгвістычнымі сродкамі, што забяспечваюць лагічнасць выказвання.

### Чысціня маўлення

(1 гадзіна)

I. Адпаведнасць маўлення літаратурным нормам.

II. Выкарыстанне моўных сродкаў у адпаведнасці з літаратурнымі нормамі, пазбяганне пазалітаратурных моўных элементаў, без патрэбы ўжытых запазычанняў, дыялектызмаў, жарганізмаў, моўных штампаў і г. д.

### Багацце і выразнасць маўлення

(2 гадзіны, з іх 1 гадзіна — на пісьмовую работу)

I. Разнастайнасць (лексічная, фразеалагічная, семантычная, вымаўленчая, сінтаксічная) маўлення. Мастацкія сродкі выразнасці: параўнанне, эпітэт, метафара, метанімія, сінекдаха і інш.

*Пісьмовая творчая работа.*

II. Валодаць слоўнікавым багаццем сучаснай беларускай мовы, умець карыстацца яе скарбамі, арганізоўваць маўленне ў залежнасці ад ступені валодання слоўным запасам.

## Дарэчнасць маўлення

(1 гадзіна)

I. Ужыванне моўных сродкаў з улікам месца, часу, мэт і ўмоў камунікацыі. Адзінства стылю.

II. Умець адбіраць моўныя сродкі ў залежнасці ад тэмы паведамлення, мэты і ўмоў камунікацыі, складу слухачоў ці чытачоў.

## Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага

(4 гадзіны, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

***Тэставая кантрольная работа і яе аналіз.***

## Рэзервовыя гадзіны

(2 гадзіны)

## ПРЫКЛАДНЫЯ ВІДЫ ПРАКТЫЧНЫХ РАБОТ

1. Чытанне (азнаямляльнае, выбарачнае, вывучальнае і інш.) тэкстаў на лінгвістычную тэму.
2. Напісанне тэзісаў і канспектаў лекцый, дакладаў, навуковых, навукова-папулярных і публіцыстычных артыкулаў.
3. Напісанне розных відаў навучальных і кантрольных работ (дыктанты, пераказы, водгукі, рэцэнзіі, тэсты і інш.).
4. Аналіз тэкстаў розных стыляў, абгрунтаванне мэтазгоднасці ўжывання ў іх пэўных моўных сродкаў.
5. Напісанне ўласных тэкстаў пэўнага стылю і жанру, тэкстаў на адну тэму ў розных стылях.
6. Рэдагаванне тэкстаў розных стыляў, знаходжанне і выпраўленне маўленчых недахопаў, арфаграфічных, пунктуацыйных і граматычных памылак.
7. Слуханне і аналіз публіцыстычных выступленняў (ці іх фрагментаў).
8. Выступленне на пэўную тэму перад аўдыторыяй.
9. Удзел у дыспутах, дыскусіях і інш.
10. Напісанне рэферата на вучэбную тэму.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ТВОРЧЫХ РАБОТ

**1. Беларусь — мая Радзіма**

Дарагія мясціны роднага краю.

Каля карты Беларусі.

Імя на абеліску.

Хатынскі звон днём і ноччу разносіцца па Беларусі.

«Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць» *(А. Ставер)*.

**2. Беларускія народныя звычаі і традыцыі**

Кожны народ мае свае святы.

Ноч, калі папараць цвіце.

«Мяняе час былыя звычкі...» *(П. Панчанка)*.

Талака — звычай узаемадапамогі, перададзены нам ад бацькоў.

**3. Мова, этыка зносін і маўленчы этыкет**

«Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі...» *(Ф. Багушэвіч)*.

«Слова — радасць, слова — чары...» *(Я. Колас)*.

«“Калі ласка!” — нашай роднай мовы шчырыя і ветлівыя словы...» *(П. Броўка)*.

**4. Прыгажосць чалавечых узаемаадносін**

Ад пустога звону карысці мала.

«Чалавеку патрэбна не слава...» *(С. Грахоўскі)*.

Дзякуй табе, дарагая матуля.

**5. Артыкул (кніга), які мяне зацікавіў**

Кніга адкрывае свет.

Скарбніца народнай мовы.

«Бачыць нябачнае, чуць нячутнае — у гэтым прызначэнне паэзіі» *(Я. Гардзіцкі)*.

**6. Музыка (спорт) у маім жыцці**

«І песню родную люблю я...» *(К. Буйло)*.

«Чароўнымі, сардэчнымі песнямі славіцца наша зямля» *(Р. Шырма)*.

Алімпійскія чэмпіёны — нашы землякі.

**7. Мой любімы від мастацтва**

Роздум пасля спектакля (канцэрта, кінафільма).

Беларускія мадонны (паводле твораў мастакоў).

На свеце шмат кніжак, скульптур, карцін...

**8. Мая сям'я і я**

Што я ведаю пра свой род?

Мой запавет нашчадкам.

«Шчасця большага няма ў зярняці, як на ніве роднай прарастаці...» *(В. Таўлай)*.

**9. Знакамітыя людзі нашай краіны**

Заснавальнік беларускай філалогіі Я. Ф. Карскі.

Іх юбілеі адзначала ўсё культурнае чалавецтва.

«Кнігі Коласа і Купалы нам калыскай і песняй былі...» *(П. Броўка)*.

**10. Кнігадрукаванне: гісторыя і сучаснасць**

Беларускі асветнік і першадрукар Францыск Скарына.

Найлепшы даведнік, дарадца.

«Жыве ў вяках беларускае слова...» *(А. Бачыла)*.

**11. Прырода і мы**

Ахоўваць і берагчы прыроду.

Чалавек — гаспадар зямлі?

## АСНОЎНЫЯ ЛІНГВІСТЫЧНЫЯ І МЕТАДЫЧНЫЯ ПРАЦЫ

*Абабурка, М. В.* Культура беларускай мовы / М. В. Абабурка. — Мінск, 1994.

*Абабурка, М. В.* Станаўленне і развіццё мовы беларускай мастацкай літаратуры / М. В. Абабурка. — Магілёў, 2000.

*Анічэнка, У. В.* Мовы ўсходніх славян / У. В. Анічэнка. — Мінск, 1989.

Асновы культуры маўлення і стылістыкі / пад рэд. У. В. Анічэнкі. — Мінск, 1992.

Беларуская граматыка: у 2 ч. / пад рэд. М. В. Бірылы, П. П. Шубы. — Мінск, 1985.

Беларуская мова: энцыклапедыя / пад рэд. А. Я. Міхневіча. — Мінск, 1994.

*Бурак, Л. І.* Пунктуацыя беларускай мовы / Л. І. Бурак. — Мінск, 1982.

*Бурак, Л. І.* Сучасная беларуская мова: арфаграфія і пунктуацыя / Л. І. Бурак, І. Л. Бурак. — Мінск, 1993.

*Валочка, Г. М.* Навучанне перакладу ў школе / Г. М. Валочка. — Мінск, 1999.

*Валочка, Г. М.* Беларуская мова ў табліцах і схемах / Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск, 2005, 2007.

*Варановіч, З. Б.* Методыка выкладання беларускай мовы / З. Б. Варановіч. — Мінск, 1995.

*Варановіч, З. Б.* Тэматычны даведнік: дапаможнік для настаўнікаў беларускай мовы / З. Б. Варановіч. — Гродна, 1997.

*Вярбіла, У. М.* Багата, родная ты мова: матэрыялы і метадычныя парады па развіцці звязнай мовы вучняў / У. М. Вярбіла [і інш.]. — Мінск, 1988.

*Гамеза, Л. М.* Лінгваметадычная сістэма ўзбагачэння слоўнікавага запасу школьнікаў 5—7 класаў / Л. М. Гамеза. — Мінск, 2002.

*Ермаловіч, А. В.* Сачыненні-апісанні: тэорыя і практыка навучання / А. В. Ермаловіч. — Мінск, 2005.

*Жуковіч, Н. В.* Сучасныя педагагічныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры / Н. В. Жуковіч. — Мінск: Аверсэв, 2007.

*Кавалевіч, З. М.* Вывучэнне лічэбніка ў школе / З. М. Кавалевіч. — Мінск, 2000.

Кароткая граматыка беларускай мовы: у 2 ч. — Мінск: Беларус. навука, 2007. — Ч. 1. Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія.

Кароткая граматыка беларускай мовы: у 2 ч. — Мінск: Беларус. навука, 2009. — Ч. 2. Сінтаксіс.

*Каўрус, А. А.* Слова наша роднае / А. А. Каўрус. — Мінск, 1986.

*Каўрус, А. А.* Стылістыка беларускай мовы / А. А. Каўрус. — Мінск, 1992.

*Красней, В. П.* Беларуская мова. Поўны школьны курс. Тэорыя / В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль. — Мінск: Аверсэв, 2007.

*Красней, В. П. Б*еларуская мова ў табліцах і схемах / В. П. Красней. — Мінск, 2008.

*Лаўрэль, Я. М.* Вывучэнне марфалогіі ў школе / Я. М. Лаўрэль, Т. Р. Новікава, С. А. Язерская. — Мінск, 1991.

*Лепешаў, І. Я.* Моўныя самацветы / І. Я. Лепешаў. — Мінск, 1985.

*Лепешаў, І. Я.* Асновы культуры мовы і стылістыкі / І. Я. Лепешаў. — Мінск, 1989.

*Ляшук, В. Я.* Міжпрадметныя сувязі ў выкладанні беларускай мовы і літаратуры / В. Я. Ляшук, Г. М. Малажай. — Мінск, 1992.

*Малажай, Г. М.* Пазакласная праца па беларускай мове / Г. М. Малажай, С. Р. Рачэўскі. — Мінск, 1990.

*Малажай, Г. М.* Беларуская мова: дапаможнік для школ, ліцэяў, гімназій / Г. М. Малажай. — Мінск, 1999.

*Малажай, Г. М.* Алімпіяды па беларускай мове / Г. М. Малажай, В. П. Красней. — Мінск, 2001, 2004.

*Малажай, Г. М.* Беларуская мова: дапаможнік для падрыхтоўкі да абавязковага цэнтралізаванага тэсціравання / Г. М. Малажай. — Мінск, 2004, 2005, 2006.

Методыка выкладання беларускай мовы: бібліяграфічны паказальнік (1969—1990 гг.) / склад. М. С. Лукошус; рэд. В. У. Протчанка. — Мінск, 1993.

Методыка выкладання беларускай мовы / пад рэд. М. Г. Яленскага. — Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2006.

*Міхневіч, А. Я.* Слоўка за слоўкам: алфавітны даведнік па культуры беларускай мовы для ўсіх / А. Я. Міхневіч, Л. П. Кунцэвіч, Ю. В. Назаранка. — Мінск, 2006.

*Падлужны, А. І.* Мова і грамадства / А. І. Падлужны. — Мінск, 1997.

Пазакласная праца па беларускай мове і літаратуры: у 2 кн. — Мінск, 2007. — Кн. 1: Калі закончыўся ўрок / В. А. Мяжэвіч.

Пазакласная праца па беларускай мове і літаратуры: у 2 кн. — Мінск, 2007. — Кн. 2: Ад свята да свята / В. А. Буланда.

*Паўлоўская, В. І.* Мова: цікава і займальна / В. І. Паўлоўская. — Мінск, 1997.

*Протчанка, В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе: просты сказ / В. У. Протчанка. — Мінск, 1986.

*Протчанка, В. У.* Вывучэнне сінтаксісу ў школе: складаны сказ / В. У. Протчанка. — Мінск, 1989.

*Протчанка, В. У.* Актуальныя пытанні тэорыі і практыкі выкладання беларускай мовы ў школе / В. У. Протчанка. — Мінск, 2001.

*Прыгодзіч, М. Р.* Шчодрасць слова / М. Р. Прыгодзіч. — Мінск, 1989.

*Саўко, У. П.* Развіццё маўлення школьнікаў пры вывучэнні марфалогіі / У. П. Саўко. — Мінск, 2000.

*Сіўковіч, В. М.* Беларуская мова ў пытаннях і адказах / В. М. Сіўковіч. — Мінск, 2005.

*Сцяцко, П. У.* Культура мовы / П. У. Сцяцко. — Мінск, 2002.

*Сямешка, Л. І.* Курс беларускай мовы / Л. І. Сямешка, І. Р. Шкраба, З. І. Бадзевіч. — Мінск, 1996.

*Сямешка, Л. І.* Беларуская мова. Уводзіны ў навуку аб мове. — Мінск, 1999.

*Цікоцкі, М. Я.* Стылістыка тэксту / М. Я. Цікоцкі. — Мінск, 2002.

*Шакун, Л. М.* Карані роднай мовы / Л. М. Шакун. — Мінск, 2001.

*Юрэвіч, У. М.* Слова жывое, роднае, гаваркое / У. М. Юрэвіч. — Мінск, 1998.

*Яўневіч, М. С.* Сінтаксіс сучаснай беларускай мовы / М. С. Яўневіч, П. У. Сцяцко. — Мінск, 2004.

*Язерская, С. А.* Асновы культуры маўлення / С. А. Язерская. — Мінск, 2004.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ

*Бадзевіч, З. І.* Дыдактычны матэрыял па беларускай мове, 9 клас / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. — Мінск: НІА, 2006.

*Бадзевіч, З. І.* Тэсты па беларускай мове, 9 клас / З. І. Бадзевіч, І. М. Саматыя. — Мінск: Юніпрэс, 2006.

Беларуская мова ў 10 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

Беларуская мова ў 11 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

*Валочка, Г. М.* Беларуская мова: дапаможнік для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання: дапам. для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, Я. М. Лаўрэль, С. А. Язерская. — Мінск: Новое знание, 2010.

*Валочка, Г. М.* Беларуская мова ў 7 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, С. А. Язерская. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

*Валочка, Г. М.* Дыдактычны матэрыял па беларускай мове, 7 клас / Г. М. Валочка, Я. М. Лаўрэль. — Мінск: НІА, 2006.

*Валочка, Г. М.* Зборнік тэматычных і выніковых кантрольных работ па беларускай мове, 5—9 класы / Г. М. Валочка [і інш. ]. — Мінск: Аверсэв, 2005.

*Васюковіч, Л. С.* Беларуская мова ў 5 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Л. С. Васюковіч, В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» за перыяд навучання і выхавання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі: тэксты для дыктантаў / склад. Л. М. Гамеза [і інш.]. — Мінск: НІА; Аверсэв, 2012.

Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» за перыяд навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі: тэксты для пераказаў / склад. Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск: НІА; Аверсэв, 2012.

Зборнік экзаменацыйных матэрыялаў па беларускай мове для агульнаадукацыйных устаноў (узровень агульнай сярэдняй адукацыі). Тэксты водгукаў і пераказаў / В. П. Красней [і інш]. — Мінск: Аверсэв, 2007, 2009.

*Зелянко, В. У.* Навучанне беларускай мове: лінгвакультуралагічны падыход. 10—11 класы: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў

устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. У. Зелянко. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

*Кананенка, Т. М.* Тэсты і кантрольныя работы па беларускай мове, 5 клас / Т. М. Кананенка. — Мінск: Аверсэв, 2005.

*Красней, В. П.* Беларуская мова ў 6 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль, С. Р. Рачэўскі. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2010.

*Красней, В. П.* Дыдактычныя матэрыялы па беларускай мове, 5 клас / В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль. — Мінск: Нар. асвета, 2005.

*Красней, В. П.* Дыдактычныя матэрыялы па беларускай мове, 6 клас / В. П. Красней, Я. М. Лаўрэль. — Мінск: Сэр-Віт, 2005.

*Мартынкевіч, С. В.* Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы (5—6 класы): вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / С. В. Мартынкевіч. — Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2010.

*Сушко, М. А.* Зборнік дыктантаў па беларускай мове, 5—9 класы (з дадатковымі заданнямі і адказамі) / М. А. Сушко, І. М. Саматыя. — Мінск: Аверсэв, 2005.

*Цыбульская, С. І.* Беларуская мова: 5—11 кл.: кантрольныя работы: дапам для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С. І. Цыбульская. — Мінск: Сэр-Віт, 2011.

*Цыбульская, С. І.* Кантрольныя тэсты па беларускай мове, 8—9 класы / С. І. Цыбульская. — Мінск: Сэр-Віт, 2005.

*Цыбульская, С. І.* Паўрочны і тэматычны кантроль па беларускай мове, 6 клас (для школ з рускай мовай навучання) / С. І. Цыбульская. — Мінск: ТэтраСістэмс, 2006.

*Цыбульская, С. І.* Рознаўзроўневыя заданні для тэматычнага і паўрочнага кантролю па беларускай мове, 5 клас (для школ з рускай мовай навучання) / С. І. Цыбульская. — Мінск: ТэтраСістэмс, 2004.

*Цыбульская, С. І.* Рознаўзроўневыя заданні для тэматычнага і паўрочнага кантролю па беларускай мове, 7 клас (для школ з рускай мовай навучання) / С. І. Цыбульская. — Мінск: ТэтраСістэмс, 2004.

*Язерская, С. А.* Беларуская мова ў 8 класе: вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С. А. Язерская. — Мінск: Нац. ін-т адукацыі, 2011.

## СЛОЎНІКІ І ДАВЕДНІКІ


*Анисим, Е. Н.* Русско-белорусский словарь для школьников / Е. Н. Анисим, О. В. Мицкевич. — Минск: Сучасная школа, 2010.

Беларускі арфаграфічны слоўнік для школьнікаў: дапам. для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / уклад.: І. У. Кандраценя, Л. П. Кунцэвіч; пад рэд. А. А. Лукашанца. — Мінск: Аверсэв, 2010.

*Капылоў, І. Л.* Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы для школьнікаў. Новыя правілы правапісу / І. Л. Капылоў, Т. М. Маракуліна. — Мінск: Сучасная школа, 2010.

*Капылоў, І. Л.* Беларуска-рускі слоўнік для школьнікаў / І. Л. Капылоў, І. У. Ялынцава. — Мінск: Сучасная школа, 2010.

*Капылоў, І. Л.* Слоўнік арфаграфічных наваўвядзенняў беларускай мовы / І. Л. Капылоў, Т. М. Маракуліна. — Мінск: Сучасная школа, 2010.

*Николаева, О. М.* Современный русско-белорусский словарь для школьников / О. М. Николаева, Т. Н. Трухан; под ред. А. А. Лукашанца. — Минск: Літаратура і Мастацтва, 2009.

*Николаева, О. М.* Современный русско-белорусский словарь / О. М. Николаева, Т. Н. Трухан; под ред. А. А. Лукашанца. — Минск: Тетрасистемс, 2011.

Пішам па-беларуску: даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі: дапам. для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч [і інш.]. — Мінск, 2010.

Разам, асобна, праз злучок: даведнік: дапам. для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / склад.: Н. Д. Бандарэнка, І. Л. Капылоў, Т. М. Маракуліна; пад рэд. А. А. Лукашанца. — Мінск: Аверсэв, 2012.

Школьны марфемны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч [і інш.]. — Мінск: Аверсэв, 2006.

Школьны словаўтваральны слоўнік беларускай мовы / А. М. Бардовіч [і інш.]. — Мінск: Аверсэв, 2006.

## Змест

Тлумачальная запіска ........................................ 3

**V клас** ........................................................ 12
**VI клас** ...................................................... 17
**VII клас** ..................................................... 24
**VIII клас** .................................................... 29
**IX клас** ...................................................... 35
**X клас** ........................................................ 40
**XI клас** ...................................................... 43

Прыкладныя віды практычных работ ................ 47
Прыкладная тэматыка творчых работ ................ 47
Асноўныя лінгвістычныя і метадычныя працы ... 49
Вучэбна-метадычныя дапаможнікі ..................... 51
Слоўнікі і даведнікі .......................................... 54

Вучэбнае выданне

ВУЧЭБНАЯ ПРАГРАМА
для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**
**V–XI класы**

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Л. Ф. Леўкіна*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Кісялёва*
Карэктар *К. В. Шобік*

Падпісана ў друк 10.02.2012. Фармат 60×84/16. Папера газетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 3,26. Ул.-выд. арк. 2,75.
Тыраж 7500 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. ЛИ № 02330/04994469
ад 08.04.2009. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Мінскае абласное ўнітарнае прадпрыемства «Барысаўская ўзбуйненая
тыпаграфія імя 1 Мая». ЛП № 02330/0150443 ад 19.12.2008.
Вул. Будаўнікоў, 33, 222120, г. Барысаў